ШОУ «МІЛЕНІУМ» АД БРЭСТА 7

ПЕРШЫЯ І ДРУГІЯ Ў АМЕРЫЦЫ 16

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

10 ВЕРАСНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 171 (29038)

ЛІЧБА ДНЯ

73 тысячы

дэпазітных рахункаў на сямейны капітал на суму каля $729 млн адкрыта ў краіне на 1 верасня, паведамляе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. У тым ліку ў студзені—жніўні сёлета адкрыта 10 018 рахункаў на агульную суму $100,18 млн. Гэтая мера, як ужо адзначалася раней, аказала ўплыў на паводзіны сем'яў. Павялічылася колькасць дзяцей, народжаных трэцімі і наступнымі. Праграма дзейнічае з 2015 года. Сямейны капітал прызначаецца ў выглядзе аднаразовай выплаты ў памеры $10 тысяч пры нараджэнні (пасля 1 студзеня 2015 года) трэцяга і наступных дзяцей. Праграма завяршаецца 31 снежня 2019 года, але эфектыўнасць гэтай меры стала падставай для падаўжэння праграмы на новую пяцігодку і распрацоўкі змяненняў у парадак выкарыстання сродкаў сямейнага капіталу. Адна з прапаноў — магчымасць датэрміновага выкарыстання грошай на будаўніцтва жылля для шматдзетных.

КАРАТКА

• У Брэсцкім абласным радзільным доме 6—8 верасня, падчас святкавання юбілею горада, на свет з'явіліся 29 малых. Таксама ў гэтыя дні ў Брэсце створаны 64 новыя сям'і.

• **Беларусь прэтэндуе на правядзенне чэмпіяната Еўропы па лёгкай атлетыцы ў 2024 годзе.**

• У Мёрскім раёне плануюць стварыць музей журавлёў і журавін.

ISSN 1990 - 763X

СПОРТ ЯДНАЕ КАНТЫНЕНТЫ

Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у цырымоніі адкрыцця матча Еўропа — ЗША

Матчавая сустрэча па лёгкай атлетыцы, бадай, самая важная спартыўная падзея восені ў Беларусі. Доказ таму і колькасць знакамітых атлетаў-удзельнікаў спаборніцтва, і запоўненыя гледачамі трыбуны стадыёна «Дынама». У падрыхтоўцы грандыёзнай дзеі ўдзельнічалі еўрапейская, міжнародная лёгкаатлетычныя асацыяцыі, беларуская федэрацыя гэтага віду спорту і органы ўлады. Як сведчанне асаблівага стаўлення беларусаў да спорту — удзел у адкрыцці матча Прэзідэнта краіны.

Вітаючы ўдзельнікаў міжкантынентальнага спаборніцтва на спартыўнай арэне, якая нядаўна была пляцоўкай для адкрыцця і закрыцця іншага маштабнага спартыўнага форуму — II Еўрапейскіх гульняў, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Упершыню ў гісторыі лёгкай атлетыкі адбудзецца сустрэча Еўропы і Злучаных Штатаў Амерыкі. Прымаць гэтыя маштабныя спаборніцтвы для нас вялікі гонар і магчымасць успомніць легендарнае мінулае стадыёна «Дынама». Стадыёна, дзе выступалі легенды спорту мінулага стагоддзя — савецкія і амерыканскія атлеты. Тады матчавая сустрэча СССР — ЗША стала прыкладам сумленнай і бескампраміснай барацьбы», — сказаў Прэзідэнт Беларусі. А галоўнае значэнне той падзеі, на думку лідара краіны, што яна стала сімвалам імкнення да палітычнай раўнавагі і мірнага саперніцтва паміж вялікімі дзяржавамі. І сёння падобныя спартыўныя спаборніцтвы здольныя мяняць палітычную сітуацыю да лепшага.

«Упэўнены, што беларуская гасціннасць і цёплая сустрэча гледачоў дапамогуць вам прадэманстраваць на арэне максімум сваіх магчымасцяў. Безумоўна, мы будзем горача падтрымліваць усіх спартсменаў. Гэта ў характары талерантных і адкрытых свету беларусаў. Мы дакладна ведаем, што, хто б ні перамог, мы — мільёны балельшчыкаў з усяго свету — станем сведкамі нараджэння новых легендаў лёгкай атлетыкі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У 2021 годзе такі ж матч павінен адбыцца ў ЗША, але ў гэтай краіне будзе праводзіцца і Чэмпіянат свету. З гэтай нагоды Прэзідэнт краіны прапанаваў арганізатарам сустрэчы правесці яе яшчэ раз у Беларусі.

Учора на стадыёне адбыліся спаборніцтвы ў 18 дысцыплінах. Усяго на «Дынама» ў 37 дысцыплінах будуць змагацца за перамогу 304 спартсмены.

Марыя ДАДАЛКА. Фота БелТА.

Па палічках

Працаваць дыстанцыйна — не значыць быць на сувязі круглыя суткі

Мінпрацы дало тлумачэнні па абноўленым Працоўным кодэксе

Як ужо пісала «Звязда», у ліпені гэтага года быў падпісаны закон, якім уносяцца змяненні ў Працоўны кодэкс. Навацыі, па словах распрацоўшчыкаў закона, дазволяць стварыць умовы для эфектыўнай і гнуткай занятасці грамадзян і збалансуюць інтарэсы наймальніка і работніка. Яны пачнуць дзейнічаць 28 студзеня 2020 года.

Пры кантракце нельга неабгрунтавана звольніць або звольніцца

Прадстаўнікі Мінпрацы, прафсаюзаў і дэпутаты на круглым стале, арганізаваным БелТА, далі тлумачэнні некаторым зменам, якія чакаюць работнікаў і наймальнікаў.

У прыватнасці, новым законам унесены змены, якія будуць датычыцца спынення працоўнага дагавора і падаўжэння (заключэння) кантрактаў з работнікамі.

СТАР. 4

Спецыяльны рэпартаж

Другое прышэсце тарпанаў

Навошта Налібоцкай пушчы патрэбны польскія конікі з Нідэрландаў

Праз 400 гадоў у Беларусь вярнуліся дзікія коні! Жывёл прывезлі з Нідэрландаў у рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Налібоцкі». Спецыялісты кажуць, што конікі вельмі добра адчуваюць сябе на беларускай зямлі, і ў якасці доказу паказваюць на жарабя, якое зусім нядаўна нарадзілася на тэрыторыі заказніка.

СТАР. 5

МІНСК ЗНОЎ СПАРТЫЎНАЯ СТАЛІЦА

Беларуская сталіца ў чэрвені гэтага года стала пляцоўкай галоўнай спартыўнай падзеі Еўропы — II Еўрапейскіх гульняў. Мінск у сферы спорту — свайго роду брэнд, які сведчыць, што мерапрыемствы пройдуць на найвышэйшым узроўні: гасцінна і якасна. Але гасціннасцю горада не спынілася на адным кантыненце — і ўчора ў сталіцы адкрыўся гістарычны матч па лёгкай атлетыцы Еўропа — ЗША. Напярэдадні спаборніцтваў арганізатараў мерапрыемства прэзідэнта Еўрапейскай лёгкаатлетычнай асацыяцыі Свена Арнэ Хансена і прэзідэнта Міжнароднай асацыяцыі лёгкаатлетычных федэрацый Себасцьяна Коу ў Палацы Незалежнасці павітаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што прысутныя на сустрэчы сталі сапраўднымі сябрамі для нашай краіны, якія пераступілі цераз прымхі, што існавалі раней у адносінах да Беларусі.

Прэзідэнт паведаміў: сам не да канца верыў, што такая падзея, як матч Еўропа—ЗША можа адбыцца ў Мінску. «Выканалі невыканальнае, калі вы паабяцалі папрацаваць над тым, каб гэта падзея сённяшняя-заўтрашняя, гэты гіганцкі матч паміж Злучанымі Штатамі і Еўропай у нас, у Беларусі, адбыўся», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што прымаць такое мерапрыемства — гонар для любой краіны. Ён канстатаваў, што Беларусь не застанецца ў даўжніках: «Мы абавязкова дабрынёй адкажам на ваш клопат — перад усім па развіцці лёгкай атлетыкі і самага галоўнага, чым вы больш за ўсё займаецеся, спадар Коу, — гэта барацьбой з допінгам».

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Еўрапейскай лёгкаатлетычнай асацыяцыі і Міжнароднай асацыяцыі лёгкаатлетычных федэрацый за дапамогу Беларусі ў падрыхтоўцы трэнерскіх кадраў, суддзяў. «І вашы парады па барацьбе з допінгам, вашы прапановы па правядзенні буйных спаборніцтваў і ўдзеле беларусаў у гэтых спаборніцтвах для нас каштоўныя, — звярнуў увагу кіраўнік краіны.— Спадар Коу, спадар Хансен, калі вы рызыкняце калі-небудзь правесці ў нас чэмпіянат Еўропы па лёгкай атлетыцы ці Брыльянтавую лігу, этапы розных відаў спаборніцтваў, чэмпіянат свету — вы аб гэтым не пашкадуеце».

Цяпер прапрацоўваецца пытанне аб пераносе ў Мінск рэгіянальнага цэнтра па развіцці лёгкай атлетыкі Міжнароднай асацыяцыі лёгкаатлетычных федэрацый. Прэзідэнт адзначыў, што ў Беларусі гэтую ідэю падтрымліваюць і гатовы пачаць работу хоць заўтра.

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што Себасцьян Коу можа разлічваць на падтрымку беларускага боку на будучых выбарах кіраўніка арганізацыі.

Матч Еўропа — ЗША — працяг традыцыі легендарных лёгкаатлетычных спаборніцтваў паміж СССР і ЗША, якія адбываліся з 1958 да 1985 года па чарзе ў гарадах дзвюх дзяржаў. У 1973 годзе падзею прымаў Мінск. «Паважаныя спадары, яшчэ раз дзякую вам, што вы сёння прыехалі, знайшлі час у сваіх шчыльных раскладах і за тую падзею, якая адбудзецца сёння на легендарным стадыёне, на якім 46 гадоў таму сустракаліся амерыканцы са спартсменамі Савецкага Саюза ў падобным лёгкаатлетычным матчы», — падвёў вынікі сустрэчы лідар Беларусі.

Марыя ДАДАЛКА.

❍ Каментарый у тэму

Прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі лёгкаатлетычных федэрацый Себасцьян Коу ў размове з журналістамі паведаміў, што абмяркоўваў з Аляксандрам Лукашэнкам стварэнне ў Мінску рэгіянальнага цэнтра па развіцці лёгкай атлетыкі. Заснаванне такой установы дасць магчымасць краіне трэніраваць спартсменаў самага высокага ўзроўню.

Кіраўнік Міжнароднай асацыяцыі лёгкаатлетычных федэрацый падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за работу па развіцці гэтага віду спорту ў Беларусі і за падтрымку дзейнасці арганізацыі па барацьбе з допінгам.

«У мяне была магчымасць яшчэ раз падкрэсліць, што спорт чарговы раз становіцца мостам паміж дзяржавамі ў такія няпростыя часы, — сказаў Себасцьян Коу. — І акрамя таго, мы абмяркоўвалі важнасць правядзення яшчэ большай колькасці спартыўных мерапрыемстваў тут, у Мінску, у горадзе, размешчаным у краіне, у якой, як нідзе разумеюць важнасць спорту».

Прэзідэнт Еўрапейскай лёгкаатлетычнай асацыяцыі Свен Арнэ Хансен падкрэсліў, што ідэю правядзення падобнага матча абмяркоўвалі з кіраўніком Беларусі тры з паловай гады таму, і Аляксандр Лукашэнка адразу згадзіўся з прапановай.

Па словах прэзідэнта Еўрапейскай лёгкаатлетычнай асацыяцыі, у адносінах да спорту ён спрабуе быць паслом Рэспублікі Беларусь. «Тут насамрэч фантастычная краіна, выдатны горад, цудоўныя людзі, на жаль, пра іх не так шмат ведаюць у свеце. Спорт — выдатная магчымасць даць людзям больш інфармацыі аб гэтай краіне», — канстатаваў Свен Арнэ Хансен.

Ён адзначыў, што з Прэзідэнтам Беларусі абмеркавалі падзею ў сферы спорту, якую пакуль не стане раскрываць: «У перспектыве нас усіх чакае вельмі цікавая навіна».

Свен Арнэ Хансен расказаў, што таксама на сустрэчы разглядалі магчымасць правядзення ў Мінску чэмпіянату Еўропы па лёгкай атлетыцы 2024 года. Беларусь разам з Польшчай і Італіяй пакуль знаходзіцца ў рангу кандыдатаў на правядзенне гэтага спаборніцтва.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Пілоты British Airways праводзяць першую ўсеагульную забастоўку

Авіякампанія British Airways адмяніла амаль 100 працэнтаў рэйсаў з-за забастоўкі пілотаў, якія патрабуюць павелічэння заработнай платы. Двухдзённая забастоўка можа сарваць планы амаль 300 тысяч чалавек. У пратэстнай акцыі 9-10 верасня ўдзельнічаюць усе 4,3 тысячы пілотаў авіякампаніі, якія патрабуюць павелічэння заработнай платы. Толькі ў першы дзень страйку адменены большасць з 850 рэгулярных рэйсаў. Па звестках Financial Times, на працягу 48 гадзін British Airways звычайна выконвае каля 1700 палётаў. Адзін дзень страйку абыдзецца авіякампаніі ў 40 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў, заявіў брытанскі прафсаюз пілотаў BALPA ў Twitter. Пры гэтым рознагалоссі паміж прафсаюзам і авіякампаніяй, якія датычацца павышэння заробкаў, па інфармацыі BALPA, складаюць пяць мільёнаў. Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Борыс Джонсан заклікаў бакі вярнуцца за стол перагавораў і ўрэгуляваць рознагалоссі.

Летняя спякота ў Францыі прывяла да смерці 1,5 тысячы чалавек

Моцная спёка ў чэрвені і ліпені ў Францыі прывяла да смерці 1,5 тысячы чалавек, паведаміла міністр салідарнасці і аховы здароўя Аньес Бюзен. У канцы ліпеня слупкі тэрмометраў у населеных пунктах гэтай краіны падымаліся да нязвыклых паказчыкаў — абсалютныя тэмпературныя рэкорды былі ўстаноўленыя ў больш чым 50 гарадах. Следам за хваляй анамальнай спёкі прыйшлі моцная засуха і высокая імавернасць лясных пажараў. Радыёстанцыя France Info адзначае, што, па дакладных звестках міністэрства аховы здароўя, было зафіксавана 1435 смерцяў: 567 падчас першага перыяду спякоты, у канцы чэрвеня — пачатку ліпеня, і 858 падчас другой хвалі моцнай спёкі, у канцы ліпеня. Аднак гэты паказчык усё роўна значна саступае перыяду анамальнай спякоты 2003 года, калі ў выніку інцыдэнтаў, звязаных з умовамі надвор'я, было зафіксавана 15 тысяч дадатковых смерцяў. У той час спякота працягвалася 20 дзён.

«Залаты леў» у «Джокера»

«Залатога льва» на 76-м Венецыянскім кінафестывалі атрымаў фільм «Джокер» Тода Філіпса з Хаакінам Феніксам у галоўнай ролі. Стужка апавядае гісторыю галоўнага ворага Бэтмена. Збяднелы комікняўдачнік вяртаецца ў родны Готэм-Сіці. Ён хацеў дарыць людзям радасць, але, сутыкнуўшыся з чалавечай жорсткасцю, ператвараецца ў страшнага злыдня, які нясе смерць і разбурэнні.

Найлепшай актрысай прызнаная француженка Арыян Аскарыд, якая выканала галоўную ролю ў сацыяльнай драме «Малітва ў імя Бога» Рабера Гедыгяна аб пакінутай без сродкаў сям'і з Марсэля. Найлепшым акцёрам стаў італьянец Лука Марынелі за галоўную ролю ў фільме «Марцін Ідэн» П'етра Марчэла паводле рамана Джэка Лондана. Гран-пры журы атрымаў Раман Паланскі за карціну аб гучнай справе Дрэйфуса, французскага афіцэра, абвінавачанага ў канцы XIX стагоддзя ў шпіянажы на карысць Германіі, а затым апраўданага.

Выбары-2019

ТРЫ ШЛЯХІ Ў ДЭПУТАТЫ

Пачалося вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў

Працягнецца гэты этап выбарчай кампаніі да 7 кастрычніка. Вылучыцца на адказную пасаду прэтэндэнты могуць трыма шляхамі — ад палітычнай партыі, працоўнага калектыву ці зборам подпісаў.

Стаць кандыдатам ад палітычнай партыі можна вылучэннем асобы падчас сходу арганізацыі. Працоўны калектыў (колькасць супрацоўнікаў якога не меншая за 300 чалавек) мае права рэкамендаваць аднаго магчымага дэпутата па той акрузе, дзе размешчана прадпрыемства. Пры вылучэнні шляхам збору подпісаў ініцыятыўная група складам не менш чым 10 чалавек павінна сабраць у акрузе 1000 подпісаў. Акрамя таго, з 9 верасня да 8 кастрычніка адбываецца вылучэнне кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі. Такое права маюць прэзідыумы мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню і адпаведныя выканкамы, а ў сталіцы — прэзідыумы Мінгарсавета і Мінгарвыканкама.

Паводле БелТА.

Запрашальнік

Выбраць «Мінчаніна года»

І пракаціцца на крутым байку можна будзе на Дні горада

Спартыўныя спаборніцтвы, міжнародныя конкурсы, тэатральныя відовішчы і фестывалі можна будзе ўбачыць у сталіцы на гэтых выхадных. Нагода выдатная — Дзень горада. Калі з нейкай прычыны вы не зможаце прыйсці на запланаваныя мерапрыемствы 14 і 15 верасня, не засмучайцеся, бо некаторыя з іх ужо можна наведаць раней. Пра гэта расказаў намеснік начальніка ўпраўлення культуры Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Аляксандр ШАСТАКОЎ:

— 13 верасня ў Палацы культуры прафсаюзаў пройдзе падвядзенне вынікаў гарадскога конкурсу прафесійнага майстэрства «Мінскі майстар», у якім прыняло ўдзел звыш 16 тысяч чалавек. Узнагароды «Найлепшы па прафесіі» атрымаюць 39 пераможцаў. У гэты ж дзень у паркавай зоне ўздоўж праспектаў Пераможцаў і Машэрава адбудзецца Міжнародны фестываль гісторыі і культуры «Менск старажытны» — інтэрактыўнае відовішча ад клубаў гістарычнай рэканструкцыі, у якім выступяць майстары не толькі з Беларусі, але і госці з Расіі, Кітая, Італіі, Украіны, Галандыі, ЗША. На пляцоўцы каля Палаца спорту 13 верасня з 14 да 18 і 14 верасня з 10 да 18 гадзін пройдуць міжнародныя спаборніцтвы «Наймацнейшы пажарны-ратавальнік», у якіх прымуць удзел прадстаўнікі абласных і Мінскага гарадскога ўпраўленняў МНС, а таксама розныя аварыйна-выратавальныя службы з дзевяці краін блізкага і далёкага замежжа: Літвы, Латвіі, Бельгіі, Польшчы і іншых. Акрамя таго, у рамках святкавання Дня горада на выхадных пройдзе закрыццё мотасезона «Rally Minsk 2019», дзе на пляцоўцы каля Палаца спорту ў першы дзень з 14 да 21 гадзіны, а ў другі — з 11 да 23 гадзін адбудзецца спаборніцтва мотакаскадзёраў з розных краін.

Прадстаўнік Мінгарвыканкама нагадаў, што святкаванне Дня горада пачнецца 14 верасня аб 11-й гадзіне раніцы з ускладання кветак да абеліска «Мінск — горад-герой». У гэты дзень для гасцей падрыхтавана шмат цікавых актыўнасцяў на розных пляцоўках сталіцы.

— На тэрыторыі Верхняга горада на Нямізе ў рамках музычна-турыстычнага сезона з 12 да 17 гадзін будзе функцыянаваць праект «Мінск інтэрнацыянальны». Ён пакажа, як праходзяць святы нацыянальных культур у беларускай сталіцы, акрамя таго, усе ахвотныя змогуць паслухаць музычныя калектывы праекта «Пешаходка», а таксама ўбачыць прадстаўленні тэатральнага праекта «Без сцэны». На вечар каля ратушы запланаваны канцэрт артыстаў балета Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра, — расказаў выступоўца.

На Кастрычніцкай плошчы ў суботу ў 20 гадзін пачнецца традыцыйная цырымонія ўручэння ўзнагарод «Мінчанін года» з удзелам Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь і майстроў мастацтваў Беларусі.

— У нядзелю гасцей сталіцы парадуе мінскі паўмарафон, які пачнецца а 9-й гадзіне раніцы, — працягвае Аляксандр Шастакоў. — А таксама «Дзень танкіста», які штогод праходзіць на тэрыторыі Парку Перамогі, гарадскі фестываль творчасці людзей з абмежаванымі магчымасцямі «Мастацтва жыць — тварыць мастацтва», што пройдзе ў Мінскім гарадскім палацы культуры.

Святочныя мерапрыемствы падрыхтаваны ў выхадныя для ўсіх раёнаў сталіцы. У Заводскім з раніцы пачнуцца дзіцячыя спаборніцтвы на бегавелах «SpeedRacer», будуць працаваць розныя дзіцячыя забаўляльныя пляцоўкі, атракцыёны і кірмаш. Для дзяўчат у гэтым раёне падрыхтаваны забег «Абцасіка». Канцэрты, майстар-класы, спартыўныя спаборніцтвы будуць працягвацца да вечара. У Ленінскім раёне на выхадных пройдзе фестываль беларускай традыцыйнай музыкі «Rajok», у Маскоўскім — раённыя спаборніцтвы па паркавым валейболе і велабіятлоне, а ў Партызанскім — маладзёжны фестываль вулічнай культуры і спорту «Minsk Street summit 2019». Госці Фрунзенскага раёна змогуць паўдзельнічаць у гонках на веласіпедах, роліках, самакатах. Акрамя таго, у Парку імя 900-годдзя горада Мінска, размешчанага за «Чыжоўка-Арэнай», пройдуць выязныя цырымоніі рэгістрацыі шлюбу. Тут жа будзе арганізавана кіназала пад адкрытым небам — сеансы бясплатныя.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Сугучча

КНІЖНЫЯ СУСТРЭЧЫ Ў МАСКВЕ

Урачыстая цырымонія ўручэння ўзнагарод XVI Міжнароднага конкурсу дзяржаў — удзельніц СНД «Мастацтва кнігі» прайшла на Маскоўскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, што завяршылася 8 верасня.

expo.vdnh.ru

Гран-пры ўзялі прадстаўнікі нашай краіны — за трохтомную персанальную энцыклапедыю «Янка Купала» выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі» атрымала спецпрыз ад Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД, сродкі на выпуск дадатковага тыражу і рассылку кнігі ў нацыянальныя бібліятэкі краін Садружнасці. Усяго ж на рахунку айчынных выдаўцоў 20 дыпломаў міжнароднага конкурсу.

Беларусь, якая сёлета ўдзельнічала ў кніжным форуме ў статусе ганаровага госця, прадставіла наведвальнікам 25 кніг праекта гісторыка і калекцыянера Уладзіміра Ліхадзедава «У пошуках страчанага», у якім злучаны гісторыя і сучаснасць, а таксама ўнікальны арт-аб'ект «Друкарскі зубр», сабраны з дэталяў друкарскіх станкоў XIX—XX стагоддзяў, і інтэрактыўную экспазіцыю «Друкарскі двор XVI стагоддзя», дзе можна было выпрабаваць на справе старажытныя тэхналогіі вырабу паперы і друкавання кніг (самастойна «выдаць» копію першай старонкі Бібліі Францыска Скарыны мог кожны пакупнік кніг на беларускім стэндзе). Штодня на розных пляцоўках выстаўкі праходзілі семінары, круглыя сталы, сустрэчы з аўтарамі і героямі кніг, аўтограф-сесіі, прэзентацыі кніжных навінак і выдавецкіх праектаў, прысвечаных знакавым падзеям у жыцці нашай краіны. Наогул беларускія выдавецтвы прадставілі некалькі тысяч найменняў кніг.

Нагадаем, удзел у найбуйнейшай у Расіі і Усходняй Еўропе 32-й Маскоўскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы ўзялі прадстаўнікі 33 краін свету. Спецыяльным госцем форуму стаў эмірат Шарджа (ААЭ) — сусветная сталіца кнігі ў 2019 годзе. За пяць дзён работы выстаўкі ў яе межах прайшло звыш 600 разнастайных мерапрыемстваў — ад прафесійных дыскусій да літаратурных квэстаў.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Карані

«СЛУЦКІЯ ПАЯСЫ» САБРАЛІ ПАЎТЫСЯЧЫ МАЙСТРОЎ

Днямі ў старажытны горад на Случы завіталі ўмельцы двух дзясяткаў кірункаў народнай творчасці (салома- і лозапляценне, разьба па дрэве і ткацтва, вышыўка і ганчарства, ткацтва паясоў і іншых) з розных куточкаў не толькі цэнтральнага рэгіёна, а і ўсёй Беларусі.

Фота s-k.by

У межах абласнога свята традыцыйных мастацкіх рамёстваў «Слуцкія паясы» прайшла прадстаўнічая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, паведамілі ў Мінаблвыканкаме. Упершыню быў праведзены інтэрактыўны конкурс юных майстроў і мастакоў «У краіне творчасці». Спаборніцтва праходзіла на інтэрнэт-пляцоўцы Facebook. Пераможцы вызначаліся шляхам адкрытага галасавання і спаборнічалі ў пяці намінацыях у дзвюх узроставых групах. Таксама прайшло свята-конкурс «Беларуская лялька».

«Сапраўднымі брэндамі Мінскай вобласці сталі капыльскія і старадарожскія ручнікі, лагойская і івянецкая керамika, клецкая і маладзечанская лаза, вілейская і мядзельская разьба па дрэве, — адзначылі арганізатары. — Случчына працягвае мастацкія традыцыі народнай творчасці свайго рэгіёна. Таму невыпадкова, што для правядзення брэндавага свята рамёстваў «Слуцкія паясы» быў абраны менавіта гэты рэгіён Міншчыны».

(Ул. інф.)

Аты-баты

Пачалася праверка войскаў

Яна закране баявую гатоўнасць часцей тэхнічнага забеспячэння, якія дыслакуюцца ў Мінскай вобласці. Праверка праводзіцца з 9 верасня ў адпаведнасці з рашэннем міністра абароны, паведамілі ў прэс-службе ведамства.

Падчас праверкі будзе ажыццяўляцца пастаўка мабілізацыйных рэсурсаў з ваенных камісарыятаў, а таксама камплектаванне ваеннай і спецыяльнай тэхнікай за кошт транспартных сродкаў, якія знаходзяцца на працяглым захоўванні і атрымліваюцца з дзяржаўных органаў і арганізацый. Праверка мае мэтай вызначыць здольнасць воінскіх часцей тэхнічнага забеспячэння выконваць пастаўленыя задачы, у тым ліку ў складанай абстаноўцы.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Трагедыя

СМЯРОТНЫ ТАРАН

Два пасажыры загінулі пры сутыкненні маршруткі Магілёў — Смаргонь з фурай на трасе М14 пад Мінскам. Такую інфармацыю ў сваім Telegram-канале размясціла прэс-сакратар МУС Вольга Чамаданава.

Фота МУС.

Аварыя адбылася каля 14.40 на 85-м кіламетры аўтадарогі М14 у напрамку трасы М1. Кіроўца маршрутнага таксі Магілёў — Смаргонь здзейсніў наезд на аўтацягнік МАЗ, які стаяў на ўзбочыне з прычыны паломкі. У маршрутным транспартным сродку знаходзіліся пяцёра пасажыраў. У выніку ДТЗ двое загінулі на месцы, кіроўца і трое пасажыраў атрымалі раненні і былі дастаўлены ў шпіталь.

Кіроўца фуры не пацярпеў. Прычыны аварыі высвятляюцца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ТАКІЯ ВОСЬ «АРЛЫ»...

нанеслі шкоду на 4,3 тысячы рублёў

Каля 17.30 старшы інспектар Столінскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету вёў кантроль за выкананнем заканадаўства ў галіне рыбалоўства і выкарыстання водных і рыбных рэсурсаў на Прыпяці.

Калі ён рухаўся на аўтамабілі па лясной дарозе да ракі, яго ўвагу прыцягнуў воз, у якім знаходзіліся чацвёра мужчын. Калі яны заўважылі інспектара, фурманка павярнула ў лес. Западозрыўшы няладнае, супрацоўнік інспекцыі вырашыў дачакацца вяртання «ўцекачоў».

Праз гадзіну гэтая ж фурманка выехала з лесу, толькі гэтым разам на ёй знаходзіліся двое мужчын у мокрай адзежы, а таксама ў павозцы ляжала яшчэ некалькі мокрых рэчаў, паведамляе УУС Брэсцкага аблвыканкама.

Пабачыўшы інспектара, возчык і яго пасажыр пачалі нервавацца, на пытанні адказвалі невыразна. Як яны растлумачылі, з кампаніяй сяброў адпачывалі ў лесе на беразе ракі, ужывалі спіртное. На пытанне, чаму мокрая адзежа, дакладна адказаць ніхто не змог. Супрацоўнік паведаміў у міліцыю.

Прыбыўшыя праваахоўнікі за некалькі метраў ад воза, у лесе, выявілі два мяхі. У адным была рыба, у другім — рыбалоўныя сеткі.

Як высветлілася, жыхары вёскі Вялікія Арлы (1969 і 1961 гадоў нараджэння), знаходзячыся на беразе Прыпяці, без належнага дазволу, выкарыстоўваючы забароненыя прылады лоўлі, здабылі 76 асобін рыбы. Прычыненая навакольнаму асяроддзю шкода ацэньваецца ў суму больш за 4300 рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Пераклады

Новая бібліятэчка твораў Уладзіміра Караткевіча

Адразу дзве кнігі беларускага класіка з'явіліся ў выдавецтве «Беларусь» — «Ладдзя роспачы» і «Каласы пад сярпом тваім».

Выдавецтва адкрыла кніжную серыю «Беларуская класіка на рускай мове». І адразу ў ёй пабачылі свет новыя пераклады прозы легендарнага беларускага пісьменніка. Такім чынам айчынныя кнігавыдаўцы распачалі падрыхтоўку да 90-годдзя Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча, якое ўся наша краіна будзе адзначаць у 2020 годзе.

Перакладчыкам твораў, што склалі зборнік аповесцяў «Ладдзя роспачы», як і рамана «Каласы пад сярпом тваім», выступіў кандыдат філалагічных навук Пятро Жаўняровіч. Вось што ён піша ў пасляслоўі да перакладу рамана: «Выдадзены на беларускай мове ў 1968 годзе, раман да цяперашняга часу стаў хрэстаматыйным творам, які палюбілі некалькі пакаленняў удзячных чытачоў. Пераклад рамана зроблены па новым Зборы твораў Уладзіміра Караткевіча. У тэкст вернуты выключаныя ў прыжыццёвых выданнях фрагменты, так што твор у нечым успрымаецца па-новаму. У любым выпадку чытанне гэтага рамана — зусім не лёгкая вандроўка па старонках дзеля адпачынку — складаная інтэлектуальная праца і суразвагі з аўтарам. Мяркуецца, у многіх выпадках ён дзякуючы свайму таленту робіць чытача сваім аднадумцам».

Яшчэ раней у адным з мінскіх выдавецтваў пабачыў свет і перакладзены Пятром Жаўняровічам раман Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні».

Мікола БЕРЛЕЖ.

Грошы

Папаўненне рахункаў праз АРІП

Цяпер магчыма ў Мінску і ў сталічным рэгіёне

Акцыянернае таварыства «Беларусбанк» уводзіць новую магчымасць папаўнення рахункаў кліентаў банка з дапамогай сістэмы «Разлік» (АРІП), паведамляе прэс-служба банка.

У прыватнасці, па інфармацыі сайта гэтай фінансавай установы, з дапамогай дадзенай паслугі можна папоўніць укладны, бягучыя рахункі, а таксама рахункі з выкарыстаннем плацежнай карткі. Для папаўнення дастаткова ведаць рахунак атрымальніка ў фармаце IBAN. Знайсці аперацыю можна ў дрэве АРІП-паслуг, па кодзе паслугі і па QR-кодзе. За яе правядзенне плата не спаганяецца. Скарыстацца паслугай можна і ў дрэве АРІП у каналах іншых банкаў, РУП «Белпошта».

Спецыялісты банка адзначаюць, што грошы залічваюцца на рахунак атрымальніка літаральна на наступны банкаўскі дзень. Такім чынам, налічэнне працэнтаў на суму папаўнення ажыццяўляецца з даты залічэння грашовых сродкаў. Рахунак атрымальніка павінен быць адкрыты ў беларускіх рублях ва ўстановах банка Мінска і Мінскай вобласці, акрамя філіялаў № 612 Барысава (ЦБП № 602, 610, 616, 621) і № 633 Салігорска (ЦБП № 607, 609, 613, 615, 620, 623). Магчымасць папаўнення ў астатніх рэгіёнах краіны праз сістэму АРІП будзе прадстаўляцца банкам паэтапна.

Сяргей КУРКАЧ.

Наўздагон

Пасля балю

Як міжнародная IT-кампанія дапамагла пры ўборцы Брэста пасля масавых гулянняў

І праўда, гулялі тры дні ўсе, а прыводзіць горад у парадак пасля святкаванняў давялося камунальнікам. Пра гэта падумалі ў міжнароднай IT-кампаніі Consulting і вырашылі правесці ўласную акцыю ў гонар 1000-годдзя горада.

Пасля масавых святкаванняў, калі горад соладка адсыпаўся, камунальнікі вельмі рана выйшлі на службу. А іх сустрэлі супрацоўнікі названай IT-кампаніі, падзякавалі за работу і падарылі тэрмакубкі з уласным лагатыпам, і не пустыя, вядома, а з гарачай духмянай кавай.

Кіраўнік брэсцкага офіса VRP Consulting Валерый ДВАРНІЧЭНКА сказаў з гэтай нагоды:

— Абмяркоўваючы розныя ідэі ў рамках святкавання юбілею, мы вырашылі быць карыснымі не ў дзень агульных гулянняў, канцэртаў, інсталяцый, а пасля ўсяго, калі Брэсту спатрэбіцца хутка «вярнуцца ў форму». Гэта робіцца рукамі канкрэтных людзей. Для іх, відавочна, дзень выдаўся не з самых простых, таму мы пастараліся крышачку падняць настрой працаўнікам. А кубак застанецца ім на ўспамін як сімвал экалагічнага варыянта посуду.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Працаваць дыстанцыйна — не значыць быць на сувязі круглыя суткі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Ігар СТАРАВОЙТАЎ растлумачыў, па якіх прычынах работнік можа звольніцца да завяршэння тэрміну дзеяння тэрміновага дагавора, кантракта.

«Калі заключаецца тэрміновы працоўны дагавор і бакі першапачаткова агаворваюць альбо тэрмін дзеяння дакумента, альбо работу, якую супрацоўнік павінен выканаць (гэта таксама будзе тэрміновы дагавор), для скасавання дагавора ў гэтым перыядзе неабходная абгрунтаваная прычына», — расказаў Ігар Старавойтаў.

У такім выпадку дзейнічае цалкам люстраны падыход: ні адзін з бакоў не можа неабгрунтавана звольніць або звольніцца. У наймальніка, які заключыў кантракт альбо тэрміновы працоўны дагавор, рычагом з'яўляецца істотнае змяненне ўмоў працы. Калі гэта адбываецца, у работніка ёсць права: ён альбо згаджаецца працаваць у іншых умовах, альбо звальняецца. Пры гэтым у наймальніка павінна быць аб'ектыўная прычына для змены істотных умоў, ён не можа проста прыдумаць яе.

Тое ж самае для работніка: артыкул 41 Працоўнага кодэкса кажа пра тое, што можна спыніць адносіны пры тэрміновым працоўным дагаворы, у тым ліку па кантракце, калі ў работніка ёсць на гэта аб'ектыўныя прычыны. Сярод такіх прычын у тым ліку надыход пенсійнага ўзросту для работніка, яго хвароба і іншае. Такім чынам, у работніка ёсць магчымасць звольніцца не толькі па пагадненні бакоў, але і па сваёй ініцыятыве.

Прафсаюзы заклікаюць звяртацца да іх, калі работадавец парушае закон

Дарэчы, прафсаюзы нярэдка сутыкаюцца з невыкананнем прынцыпу люстраных адносін. Па словах **начальніка галоўнага ўпраўлення юрыдычнай работы і прававога забеспячэння апарата Савета ФПБ Марыны ЛАЗАР,** да іх масава паступалі звароты грамадзян. У прыватнасці, яны датычыліся 41-га артыкула, калі наймальнік не хацеў звальняць работніка, у якога былі абгрунтаваныя прычыны, ці парушаліся нормы заканадаўства альбо кантракта з работнікам.

«Мы ў рамках сваіх паўнамоцтваў ажыццяўляем грамадскі кантроль, выдаём рэкамендацыі, і наймальнікі, як правіла, гэта выконваюць. Калі не, тады прававая інспекцыя ідзе з гэтым работнікам у суд і там прадстаўляе яго інтарэсы», — адзначае Марына Лазар. Таксама ў калектыўным дагаворы можна дадаткова прапісаць прычыны, якія стануць падставай для спынення кантракта па ініцыятыве работніка.

Што такое дыстанцыйная работа і чым яна адрозніваецца ад надомнай?

Працоўны кодэкс дапоўнены асобным раздзелам 251, які датычыцца асаблівасцяў рэгулявання працы работнікаў, якія працуюць дыстанцыйна.

Як тлумачыць на сваім сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, дыстанцыйнай работай будзе лічыцца тая, якую работнік выконвае па-за месцам знаходжання наймальніка з выкарыстаннем для выканання гэтай работы і ажыццяўлення ўзаемадзеяння з наймальнікам інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

На работнікаў, якія ажыццяўляюць дыстанцыйную работу, будуць распаўсюджвацца агульныя нормы Працоўнага кодэкса, у тым ліку ў частцы працягласці рабочага часу і часу адпачынку, водпускаў і г. д. Такім чынам, асобам, якія працуюць на дыстанцыі і якія заключылі працоўны дагавор, будуць давацца ўсе сацыяльна-працоўныя гарантыі, прадугледжаныя працоўным заканадаўствам. Нягледзячы на тое, што ў штатным раскладзе павінна адлюстроўвацца наяўнасць такога работніка, асаблівасцю гэтых працоўных адносін стане тое, што наймальніку не трэба будзе абсталёўваць рабочае месца непасрэдна ў офісе або іншым памяшканні. У сувязі з гэтым у працоўным дагаворы абавязкова павінна быць пазначана, што работа з'яўляецца дыстанцыйнай.

У адрозненне ад работнікаў-надомнікаў, якія выконваюць работу па месцы свайго жыхарства або ў іншых памяшканнях па іх выбары па-за памяшканнямі наймальніка, работнік, які ажыццяўляе дыстанцыйную работу, зможа выконваць яе з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у любым месцы, дзе будзе зручна яму самому.

Дыстанцыйная работа будзе пачынацца з асабістай сустрэчы

Новым законам прадугледжваецца, што заключэнне працоўнага дагавора з работнікам, які будзе выконваць дыстанцыйную работу, павінна ажыццяўляцца толькі пры асабістай прысутнасці работніка.

У Расіі, па словах Ігара Старавойтава, таксама ёсць нормы рэгулявання дыстанцыйнай работы. З аднаго боку, яны падобныя на тыя, што прыняты ў Беларусі, але ёсць нюансы. Напрыклад, няма патрабавання асабістай сустрэчы наймальніка і работніка пры падпісанні працоўнага дагавора. У Расіі, калі кажуць аб дыстанцыйнай рабоце, больш думаюць пра адлегласці. Бо, напрыклад, паміж Масквой і Уладзівастокам велізарная адлегласць. «Мы ж, калі гаворым аб дыстанцыйнай рабоце, вядзём гаворку пра тое, што спрабуем рэгуляваць новую мабільную форму працы. Работнік можа знаходзіцца ад наймальніка зусім недалёка, пры гэтым ён працуе ў пэўнай форме адносін, у мабільным рэжыме, калі ў яго няма пэўнага рабочага месца. Гэта галоўная ідэалогія, якая была закладзена ў нашай частцы «Дыстанцыйная работа». Галоўнае, што чалавек атрымлівае права ў мабільным рэжыме, не прывязваючыся да нейкага месца, выконваць работу і быць супрацоўнікам арганізацыі», — адзначыў намеснік міністра.

Пры гэтым норма аб неабходнасці наймальніку і будучаму работніку сустрэцца пры падпісанні працоўнага дагавора падвяргалася крытыцы. Але, як адзначыў на круглым стале **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і**

staff-online.ru

сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Віталь ШЫЛАЎ, наймальнік павінен убачыць таго работніка, за якога ён будзе плаціць узносы ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва, якому будзе забяспечваць сацыяльнае страхаванне, аплачваць адпачынак. Пасля гэтага яны могуць не сустракацца. «Магчыма, у будучыні мы прыйдзем і да электроннай працоўнай кніжкі, будзем заключаць смарт-кантракты», — дадаў дэпутат.

Мінпрацы і прафсаюзы будуць абараняць дыстанцыйных работнікаў

— Ёсць адна сур'ёзная праблема, — заўважыў Ігар Старавойтаў. — Паколькі такі работнік не прывязаны да офіса, ён не абаронены ад таго, што наймальнік можа звязвацца з ім практычна кругласутачна. У адрозненне ад работніка, які прыйшоў з работы дадому і можа заняцца сваімі справамі, дыстанцыйны работнік знаходзіцца пастаянна ў кантакце, таму часцяком у такіх людзей узнікаюць пэўныя стрэсавыя сітуацыі і захворванні. Мы з дапамогай прафсаюзаў будзем сачыць за гэтай праблемай, маніторыць, наколькі яна для нас стане актуальнай.

Калі такія праблемы будуць узнікаць, то, паводле слоў намесніка міністра, трэба будзе падумаць над устаноўкай нейкіх патрабаванняў. Напрыклад, каб наймальнік у пэўны час сутак не выходзіў на сувязь, не адпраўляў пошту, каб работнік быў вольны ад сваіх абавязкаў.

Якія яшчэ навацыі чакаюць нас?

Нагадаем, што новы закон рэгулюе парадак часовага пераводу са згоды работніка на іншую работу, у тым ліку да іншага наймальніка. Ён замацоўвае дадатковыя сацыяльна-працоўныя гарантыі, у тым ліку дае бацьку па яго жаданні адпачынак (да 14 каляндарных дзён) пры нараджэнні ў сям'і дзіцяці; здымае забарону на накіраванне ў службовую камандзіроўку жанчын, якія маюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў. Сярод іншых навацый — магчымасць працаваць па сумяшчальніцтве поўны рабочы дзень або змену ў перыяд працоўнага водпуску. Памер выхадной дапамогі павялічаны да адной сярэднямесячнай заработнай платы, калі звальненне работніка адбылося з прычыны ўстанаўлення няпоўнага рабочага часу (менш за палову нормы). Таксама замацаваны нормы, якія прадугледжваюць, што матэрыяльная адказнасць супрацоўнікаў, якія працуюць па кантракце, надыходзіць у тых жа выпадках і пры тых жа ўмовах, што і ў работнікаў, з якімі заключаны працоўныя дагаворы, г. зн. толькі за наўмыснае прычыненне маёмаснай шкоды.

Святлана БУСЬКО.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

У КРАІНЕ СТВАРАЕЦЦА АВІЯЦЫЙНАЯ ІНСПЕКЦЫЯ

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 04.09.2019 № 328 «Аб стварэнні ўстановы» арганізуецца дзяржаўная ўстанова «Авіяцыйная інспекцыя» з мэтай рэалізацыі міжнародных абавязацельстваў Рэспублікі Беларусь у галіне бяспекі палётаў і авіяцыйнай бяспекі, прынятых у адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

Авіяцыйная інспекцыя будзе падпарадкоўвацца непасрэдна Дэпартаменту па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый, з'яўляцца яго інспектарскім органам і ажыццяўляць шэраг функцый спецыяльна ўпаўнаважанага органа ў галіне грамадзянскай авіяцыі ў рамках міжнародных абавязацельстваў дзяржавы па выкананні патрабаванняў ІКАО.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БЕЛАРУСЬ ПАМЯТАЕ

Восьмага верасня споўнілася 78 гадоў са дня, калі самкнулася кола варожай блакады вакол Ленінграда. 900 дзён і начэй правялі гараджанне ў акружэнні, за гэты час з трох мільёнаў чалавек у жывых засталася толькі трэць.

Грамадскія аб'яднанні «Беларускі Саюз блакаднікаў Ленінграда» і «Непаўналетнія ахвяры блакаднага Ленінграда» пры падтрымцы Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны правялі ў гэты дзень гарадскую акцыю памяці і смутку «Ніхто не забыты, нішто не забыта». У праграме — ускладанне кветак да Стэлы «Мінск — горад-герой» і канцэрт-рэквіем, які пройдзе ў канферэнц-зале Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

НА ЛЯЧЭННЕ ЗБІРАЛІ СЯМ'ЁЙ

Усё скрала жанчына, якая даглядала цяжкахворую.

Праваахоўнікі крымінальнага вышуку Мінскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце затрымалі 35-гадовую жыхарку Нясвіжскага раёна.

Як паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама, 52-гадовага мужчыну напаткала сумная доля — яго жонка цяжка захварэла. Каб дапамагчы ёй, муж і сваякі вырашылі сабраць грашовыя сродкі на лячэнне ў сталіцы. Блізкія дапамагалі чым маглі: хтосьці грашыма, нехта дарагімі ювелірнымі вырабамі. Агульная сума сабраных сродкаў склала каля 24 тысяч рублёў. З імі муж з жонкай адправіліся на лячэнне ў сталіцу. Аднак грошы не спатрэбіліся — жанчыну выратаваць не ўдалося.

Даведаўшыся пра тое, што здарылася, мужчына добра выпіў, пасля чаго апынуўся на чыгуначным вакзале. Там яму вырашылі дапамагчы неабыякавыя грамадзяне: маладыя людзі датэлефанаваліся да знаёмай, якая раней даглядала памерлую жонку. Жанчына адказала, што пад'едзе і дапаможа дабрацца да гасцініцы. Яна сапраўды зрабіла гэта, аднак пасля таго, як мужчына заснуў у нумары, скрала з яго сумкі каштоўнасці і грошы.

Прачнуўшыся раніцай і не знайшоўшы ювелірных вырабаў, мужчына падумаў, што яго абрабавалі на вакзале. Па вяртанні ў Віцебск пацярпелы расказаў сваякам пра тое, што адбылося. Сям'я адразу ж звярнулася да праваахоўнікаў.

Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Мінскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце затрымалі 35-гадовую зламысніцу па месцы жыхарства. Частку выкрадзенай маёмасці жанчына паспела здаць у ламбард, а грошы выдаткаваць на асабістыя патрэбы.

ЗАСЫПАЛА ТРАІХ, ДВОЕ З ІХ ЗАГІНУЛІ

У Маладзечне праводзяць праверку гібелі двух мужчын пры абрушэнні грунту ў траншэі, паведамілі ў Следчым камітэце. Няшчасны выпадак адбыўся на тэрыторыі гаражнага кааператыва.

Трое мужчын праводзілі земляныя работы па ўладкаванні ліўневай каналізацыі з уласнай ініцыятывы. У нейкі момант адбылося абвальванне грунту ў траншэі, глыбіня якой складала больш за два метры, шырыня — паўтара. У выніку тры чалавекі былі засыпаны. Супрацоўнікі МНС, якія прыбылі на месца, дасталі мужчын. Пасля правядзення рэанімацыйных мерапрыемстваў медыкі канстатавалі смерць дваіх — 20-гадовага і 37-гадовага, трэці, 43-гадовы, быў шпіталізаваны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Другое прышэсце тарпанаў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паўтары сотні дзікіх коней пакуль агароджаны электрычным дротам — яны знаходзяцца на каранціне пад камерамі і пастаянным наглядам ветэрынараў, але ўжо праз два месяцы змогуць бесперашкодна перамяшчацца па пушчы. Здаецца, гэтых спакойных і прыгожых жывёл, якія часам быццам пазіруюць для фотаздымкаў, вельмі лёгка прыручыць. Але мэту такую заказнік не ставіць. Наадварот, па дамоўленасці з нідэрландскім запаведнікам, што на бязвыплатнай аснове перадаў коней пушчы, гэта нават забаронена, як і падкормліваць жывёл (за выключэннем суровых маразоў), абараняць іх ад драпежнікаў і аказваць ветэрынарную дапамогу.

— Калі мы хоць аднаго каня пачнём выкарыстоўваць у гаспадарчых мэтах, то заплацім штраф у памеры 1000 еўра. І я з такімі ўмовамі цалкам згодны. Гэтыя жывёлы павінны выконваць тую ролю, дзеля якой і прызначаны ў прыродзе, — падкрэслівае **дырэктар заказніка Васіль ГУРКОЎ** *(на фота)*.



А роля іх вельмі цікавая — расчышчаць лугі ад высокай травы і трыснягу, каб іншыя жывёлы (зубры, алені і г. д.) маглі сілкавацца маладой травой на тэрыторыі пушчы і не выходзілі шукаць яе на агароды і калгасныя палі. Прасцей кажучы, конікі будуць выконваць функцыю газонакасілкі. І за тры тыдні статак ужо ачысціў каля 40 гектараў палёў.

— Раней амаль у кожнага была карова, таму тут пасвілі скаціну, нарыхтоўвалі сена. Цяпер у вакольцах ужо не засталося скаціны, і тыя дзікія жывёлы, якія ёсць у пушчы, не паспяваюць самі расчышчаць сабе тэрыторыі, вось і выходзяць у людзі, — расказаў **начальнік аддзела паляўнічай гаспадаркі Мінлясгаса Аляксандр КАЗАРЭЗ.** — А яно як — калі траву ніхто не выядае і не скошвае, то ўтвараецца травяністы дэтрыт, ён перагнойваецца і становіцца непажыўны для жывёл. Акрамя таго, паступова лугі зарастаюць хмызнякамі. Усё гэта прыводзіць да падзення біяразнастайнасці і прадукцыйнасці экасістэм.

Дарэчы, у Беларусі дзікія коні жылі і раней. Вядома, што яшчэ Вітаўт перад Грунвальдскай бітвай у 1409 годзе адлоўліваў тарпанаў на тэрыторыі Налібоцкай пушчы, ды і пасля гэтага іх вельмі часта выкарыстоўвалі ў ваенных мэтах. А пазней гэтых коней пачалі масава знішчаць, бо лічылі шкоднікамі сельскай гаспадаркі. Ад такога моцнага людскога ўціску 400 гадоў таму тарпаны цалкам зніклі з тэрыторыі нашай краіны. А гэта, у сваю чаргу, паўплывала на падзенне папуляцыі зубра, лічаць спецыялісты.

— Гэта другое прышэсце тарпанаў, — адзначыў Васіль Гуркоў. — Хоць іх і нельга назваць чыстакроўнымі. Яны маюць большую частку генаў ад тарпанаў і трохі ад польскага коніка, таму называюцца тарпанападобнымі. Але яны не інвазійныя для нашай краіны, бо тарпаны і раней тут жылі.

Па словах экспертаў, гэтая парода была створана ў 1930 годзе на тэрыторыі польскай часткі Белавежскай пушчы. Вучоныя зыходзілі са знешніх прыкмет, бо генетычных аналізаў тады не было. Пасля Вялікай Айчыннай вайны тарпанападобныя коні трапілі ў Германію, затым вярнуліся ў Польшчу, а пасля «пераехалі» ў Нідэрланды. Нам прапанавалі супрацоўнічаць па такой прыродаахоўнай канцэпцыі, як рэвайлдынг, што значыць паэтапнае аднаўленне характэрных для рэгіёна высокапрадукцыйных экасістэм шляхам вяртання буйных жывёл у месцы іх спрадвечнага арэалу.

— Конікамі ўжо зацікавіліся мясцовыя ваўкі, прыходзіў паглядзець на новых жыхароў і мядзведзь, таму рэгуляваць іх колькасць будзе каму. Але не думайце, што іх тут цяпер усіх з'ядуць. Нягледзячы на свой мірны выгляд, самцы могуць абараніць сваю сям'ю, — адзначыў Аляксандр Казарэз.

Спецыялісты таксама падкрэсліваюць, што конікі дакладна не пачнуць выходзіць за межы пушчы, як, напрыклад, зубры.

— Перад усяленнем тарпанападобных коней у пушчу была праведзена вялікая работа. Мы на працягу двух гадоў вывучалі вопыт Латвіі і Галандыі, дзе такія коні ўжо ёсць. Практыка паказвае, што гэтыя жывёлы прытрымліваюцца сваёй тэрыторыі, яны даволі кансерватыўныя, — падкрэсліў **загадчык лабараторыі папуляцыйнай экалогіі наземных пазваночных і кіравання біярэсурсамі НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах, кандыдат біялагічных навук Васіль ШАКУН.** І дадаў, што на аднаго каня патрэбна 1-2 гектары зямлі. У «Налібоцкім» каля 350 гектараў зарослых лугоў. Значыць, пушча можа размясціць 200—300 асобін. Але гадаваць іх тут у вялікай колькасці няма сэнсу. У Беларусі ёсць яшчэ шмат месцаў, дзе можна стварыць новыя папуляцыі. Напрыклад, пойма Прыпяці зарастае, ёсць праблемы і над Дняпром — гэта тыя месцы, дзе раней таксама пасвілі жывёл. Таму, верагодна, хутка конікаў можна будзе сустрэць не толькі ў Налібоцкай пушчы.

Кацярына ЦІТОВА, фота аўтара.

❍ Дарэчы

Калі фатаграфавала, заўважыла коніка, які сваім ярка-аранжавым колерам выбіваўся са светла-шэрага табуна. Аказалася, гэты малады жарабец трапіў сюды са сваёй сям'ёй — сем'і наўмысна не разбівалі, каб не ўмешвацца ў асабістыя адносіны жывёл. Цяпер яго плануюць злавіць і аддаць ці на ферму, ці ў заапарк, каб ён не перадаў свае адрозненні іншым членам табуна і не парушыў генафонд.

Надвор'е

АПОШНІЯ ДНІ АМАЛЬ ЛЕТНЯГА ЦЯПЛА

Увесь тыдзень будзе практычна без ападкаў і да плюс 28 градусаў, а ў суботу пахаладае

Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

Першая палова верасня працягвае нас радаваць практычна жнівеньскім надвор'ем, калі сярэднясутачная тэмпература на 2—4 градусы перавышае кліматычную норму, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сіноптыкі адзначаюць, што так цёпла ў першай дэкадзе верасня ў нашай краіне бывае адзін раз на 10—15 гадоў. Сінаптычная сітуацыя застанецца роўнай аж да пятніцы. Цёплыя паветраныя масы будуць уплываць на ўмовы надвор'я, а фон атмасфернага ціску па-ранейшаму застанецца павышаны. Захаваецца воблачнасць, але дажджоў будзе мала. Сёлета ў многіх рэгіёнах краіны адзначаецца дэфіцыт ападкаў. Па паўднёвым усходзе краіны захаваецца высокая пажаранебяспека.

У сераду будзе пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах па поўначы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі чакаецца слабы туман. Вецер прагназуецца паўднёва-ўсходні, паўднёвы ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 7 да плюс 14 градусаў, удзень будзе 20—26 цяпла, па паўднёвым усходзе — да плюс 28 градусаў.

Камфортнае надвор'е чакаецца і ў чацвер. У гэты дзень будзе пераважна без ападкаў, толькі месцамі па паўночна-заходняй частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Вецер прагназуецца паўднёвы ўмераны, удзень у паўночна-заходніх раёнах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 7—14 градусаў вышэй за нуль. Удзень будзе ад плюс 20 градусаў па паўночным захадзе да 28 градусаў цяпла па паўднёвым усходзе краіны. У пятніцу ўначы і раніцай месцамі чакаецца слабы туман. Вецер прагназуецца заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 7—14 градусаў вышэй за нуль. Удзень будзе таксама цёпла — плюс 18—25 градусаў, па паўднёвым усходзе — да 27 цяпла.

Па папярэдніх прагнозах айчынных сіноптыкаў, у наступныя выхадныя сітуацыя ў атмасферы зменіцца. Спецыялісты заўважылі, што актывізуецца цыкланічная дзейнасць у Паўночнай Атлантыцы. У халодным паветры ўтворыцца цыклон, яго атмасферны фронт, ссоўваючыся цераз нашу краіну, стане адціскаць цёплае паветра за яе межы. Пачнецца пахаладанне. Змены адчуюцца ўжо ўначы ў суботу, тэмпература паветра ўначы складзе 6—12 цяпла, месцамі да плюс 14 градусаў. Удзень будзе ад плюс 13 да плюс 18 градусаў, па паўднёвым усходзе — каля 20 цяпла. У нядзелю стане яшчэ больш холадна.

Сяргей КУРКАЧ.

А не шкодзь!

ЗА НОЧ — 280 КІЛАГРАМАЎ РЫБЫ

Вось толькі ганарыцца такім уловам жыхар Салігорска не зможа, бо здабыў яго ў Жыткавіцкім раёне незаконна.

Ранкам у аператыўна-дзяжурную службу Жыткавіцкага РАУС паступіла паведамленне ад супрацоўнікаў вартавой аховы ААТ «Дослед-ны рыбгас Белае» аб тым, што падчас незаконнай лоўлі рыбы з сажалкі быў затрыманы мужчына.

На месцы здарэння праваахоўнікі выявілі 30-гадовага непрацуючага жыхара Салігорска. Пры сабе ў яго былі поліпрапіленавыя мяшкі, у якія была раскладзена выкрадзеная рыба.

Як было ўстаноўлена, мужчына прыехаў да сажалкі напярэдадні ўвечары і расставіў па вадаёме чатыры рыбалоўныя сеткі, кожная працягласцю каля 50 метраў. На працягу ночы яму ўдалося сабраць немалы ўлоў. У агульнай складанасці «рыбак» незаконна прысвоіў 270 кілаграмаў карпа і больш за восем кілаграмаў таўсталобіка, паведамляе УУС Гомельскага аблвыканкама.

Следчым камітэтам па гэтым факце заведзена крымінальная справа за крадзеж. Падазраванаму пагражае пакаранне грамадскімі работамі, або штрафам, або папраўчымі работамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ об эмиссии жилищных облигаций первого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «БЕЛХАНТЕР»

1. Полное и сокращенное наименование эмитента:

на белорусском языке: полное – Таварыства з абмежаванай адказнасцю «БЕЛХАНТЭР»; сокращенное – ТАА «БЕЛХАНТЭР»;

на русском языке: полное – Общество с ограниченной ответственностью «БЕЛХАНТЕР» (далее – эмитент); сокращенное – ООО «БЕЛХАНТЕР».

2. Место нахождения эмитента: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, ул. Кирова, 8, помещение 37-5; телефон: 8 (044) 5009121, факс: нет; электронный адрес (e-mail): www.idalpstroi.by@yandex.by; официальный сайт Эмитента в глобальной компьютерной сети Интернет: нет.

3. Эмитент зарегистрирован Минским городским исполнительным комитетом (далее – Мингорисполком) 13 сентября 2011 г. Регистрационный номер 191667503.

4. Денежные средства в белорусских рублях, поступающие при размещении жилищных облигаций настоящего выпуска, будут зачисляться на расчетный счет эмитента № BY28PJCB30120352061000000933 в ЦБУ 113 «Приорбанк» Открытое акционерное общество, БИК PJCBBY2X.

5. Депозитарием эмитента является депозитарий открытого акционерного общества «БПС-Сбербанк»: зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 28 декабря 1991 г., регистрационный № 25; действует на основании специального разрешения (лицензии) № 02200/5200-1246-1086 на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выданного Министерством финансов Республики Беларусь; место нахождения: 220005, Республика Беларусь, г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6.

6. Основной вид деятельности эмитента: реализация проектов, связанных со строительством зданий.

7. Единственный участник эмитента принял решение о первом выпуске жилищных облигаций и утвердил Решение о первом выпуске жилищных облигаций 12 августа 2019 г. № б/н.

8. Эмитент является заказчиком (застройщиком) объекта строительства: «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями по пр-ту Дзержинского» (далее – объект строительства). Строительство объекта осуществляется в две очереди.

Государственная экспертиза архитектурного проекта объекта строительства проведена Республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза»: Заключение государственной экспертизы (положительное) от 22 марта 2018 г. № 76-15/18.

Объектом жилищного строительства по настоящему выпуску облигаций является многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями по пр-ту Дзержинского (далее – жилой дом).

Права эмитента на земельные участки, необходимые для обеспечения строительства жилого дома, подтверждены:

решением Мингорисполкома от 7 июня 2018 г. № 1866 «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства»;

договором аренды земельного участка от 6 августа 2018 г. № б/н с Мингорисполкомом;

свидетельством (удостоверением) № 500/1323-10870 от 9 августа 2018 г. о государственной регистрации в отношении земельного участка с кадастровым номером 500000000005008111;

свидетельством (удостоверением) № 500/1323-10871 от 9 августа 2018 г. о государственной регистрации в отношении земельного участка с кадастровым номером 500000000005008112;

свидетельством (удостоверением) № 500/1323-10872 от 9 августа 2018 г. о государственной регистрации в отношении земельного участка с кадастровым номером 500000000005008113.

Проектом предусмотрено строительство объекта в две очереди:

Нормативная продолжительность строительства 1-й очереди строительства – 9 месяцев, в том числе подготовительный период – 1 месяц.

Нормативная продолжительность строительства 2-й очереди строительства – 24 месяца, в том числе подготовительный период – 1 месяц.

Предполагаемая дата приемки в эксплуатацию Жилого дома – 30 июня 2020 г.

9. Облигации первого выпуска – жилищные, именные, конвертируемые эмиссионные ценные бумаги в бездокументарной форме, имеющие равную номинальную стоимость и сроки осуществления прав в рамках настоящего выпуска вне зависимости от времени приобретения облигации (далее – облигации).

Объем выпуска облигаций – 7 719 000 белорусских рублей.

Количество облигаций – 3000 штук.

Облигация имеет номинальную стоимость 2573 (две тысячи пятьсот семьдесят три) белорусских рубля и эквивалент этой стоимости, выраженный в квадратных метрах общей площади жилого помещения в жилом доме, равный 1 квадратному метру. Указанный эквивалент номинальной стоимости остается неизменным.

Доход по облигациям не начисляется и не выплачивается.

10. Выпуск облигаций зарегистрирован Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов 05.09.2019 г.

Государственный регистрационный номер: 5-200-02-3810.

11. Эмитент осуществляет эмиссию облигаций в соответствии с подпунктом 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 г. № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг».

Исполнение обязательств эмитента по облигациям обеспечено поручительством Общества с ограниченной ответственностью «ДЕКО-ПЛАСТ» (далее – поручитель) (Республика Беларусь, 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 5-й этаж, офис 3, УНП 600422579). Договор о предоставлении поручительства от 12 августа 2019 г. № б/н.

Поручитель принимает на себя безусловное и безотзывное обязательство солидарно с эмитентом исполнить обязательства перед владельцами облигаций в объеме 7 719 000 белорусских рублей в случае неисполнения либо ненадлежащего исполнения данных обязательств эмитентом.

12. Размещение облигаций осуществляется эмитентом путем открытой продажи на неорганизованном рынке юридическим и (или) физическим лицам – резидентам и (или) нерезидентам Республики Беларусь (далее – покупатели облигаций).

Дата начала размещения облигаций: 30 августа 2019 г.

Дата окончания размещения облигаций: 30 октября 2020 г., если иная дата не будет определена Общим собранием участников эмитента в порядке и в сроки, установленные законодательством о ценных бумагах.

Отношения сторон оформляются:

договором с эмитентом, заключенным в простой письменной форме, предусматривающим обязательства эмитента по строительству жилых помещений в жилом доме владельцу облигаций, а также иные существенные условия в соответствии с законодательством (далее – договор с эмитентом);

договором купли-продажи облигаций, который имеют право заключать покупатели облигаций, заключившие договор с эмитентом.

Для заключения договора с эмитентом и договора купли-продажи облигаций покупатели могут обратиться к эмитенту по адресу: 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 4-й этаж, офис 14;

в срок с 30 августа 2019 г. по 30 октября 2020 г., ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Открытая продажа облигаций осуществляется по договорной цене, определяемой эмитентом в зависимости от ситуации на рынке строительства и недвижимости на момент продажи облигаций, а также исходя из соотношения спроса и предложения на рынке ценных бумаг. При этом максимально допустимая цена размещения облигации – 3 675 белорусских рублей.

13. Срок обращения облигаций – 670 календарных дней (с 30 августа 2019 г. по 30 июня 2021 г.).

14. Эмитент осуществляет досрочное погашение облигаций при невозможности замены обеспечения исполнения обязательств по облигациям либо невозможности предоставления дополнительного обеспечения в случаях, установленных законодательством о ценных бумагах.

Кроме того, эмитент вправе по собственной инициативе осуществить досрочное погашение облигаций в случае ввода жилого дома в эксплуатацию ранее даты начала погашения облигаций, указанной в пункте 15 настоящего документа, в случае досрочно выкупленных у владельцев облигаций на условиях, указанных в Проспекте эмиссии жилищных облигаций первого выпуска эмитента (далее – проспект эмиссии), а также в случае проведения конвертации облигаций до даты окончания срока обращения облигаций.

15. Дата начала погашения облигаций – 30 июня 2021 г.

Правом на получение жилого помещения в жилом доме либо номинальной стоимости облигации при погашении (досрочном погашении) облигаций обладают лица, имеющие действующий договор с эмитентом и указанные в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием эмитента:

для целей погашения облигаций – на 23 июня 2021 г.;

для целей досрочного погашения облигаций – за 5 рабочих дней до установленной эмитентом даты досрочного погашения облигаций.

16. Ознакомиться (визуально) с проспектом эмиссии (изменениями и (или) дополнениями в проспект эмиссии – при наличии) можно ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством), с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 в месте продажи облигаций, указанном в пункте 12 настоящего документа.

Директор
ООО «БЕЛХАНТЕР» **А. В. Дражнюк**

Главный бухгалтер
ООО «БЕЛХАНТЕР» **В. В. Гарбулина**

Информация о внесении изменений в извещение о проведении аукциона

В извещении о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Универмаг «Солигорск», опубликованном в газете «Звязда» от 05.09.2019, изменяется дата проведения аукциона:

Аукцион состоится **20.09.2019 в 15.00 по адресу:** г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 19.09.2019 до 16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

УНП 600024725

---

20 сентября 2019 года в 14.00 в актовом зале общества состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Вишневка – 2010» с повесткой дня:

1. Об утверждении Положения о Наблюдательном совете ОАО «Вишневка – 2010»;
2. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Вишневка – 2010»;
3. О доизбрании членов Наблюдательного совета ОАО «Вишневка – 2010».

Регистрация участников общего собрания акционеров будет осуществляться 20 сентября 2019 года с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.

Для регистрации необходимо иметь при себе: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по месту нахождения общества (Минский район, а. г. Вишневка, ул. Центральная, д. 1А) с 08.00 до 17.00 с 11 по 19 сентября 2019 года. УНП 600041880

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»
220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2019 г.

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»
(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2019 год	2018 год
1	2	3	4	5
1	АКТИВЫ			
2	Денежные средства	1101	321 185	304 430
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	494	175
4	Средства в Национальном банке	1103	1 324 388	1 149 180
5	Средства в банках	1104	2 686 175	3 845 080
6	Ценные бумаги	1105	4 088 808	4 671 330
7	Кредиты клиентам	1106	19 766 011	19 134 305
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Инвестиции в зависимые юридические лица		117 709	113 397
10	Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица		-	-
11	Долгосрочные финансовые вложения	1108	28 929	28 928
12	Основные средства и нематериальные активы	1109	433 548	439 463
13	Доходные вложения в материальные активы	1110	42 606	39 203
14	Имущество, предназначенное для продажи	1111	40	338
15	Отложенные налоговые активы	1112	1 318	1 318
16	Деловая репутация		-	-
17	Прочие активы	1113	71 776	102 516
18	ИТОГО активы	11	28 882 987	29 829 663
19	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
20	Средства Национального банка	1201	84 043	789 997
21	Средства банков	1202	4 761 121	4 804 050
22	Средства клиентов	1203	18 128 526	18 351 715
23	Ценные бумаги банка	1204	1 664 497	1 712 685
24	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
25	Отложенные налоговые обязательства	1206	1 459	1 459
26	Прочие обязательства	1207	175 162	146 596
27	ВСЕГО обязательства	120	24 814 808	25 806 502
28	СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
29	Уставный фонд	1211	2 669 093	2 669 093
30	Эмиссионный доход	1212	-	-
31	Резервный фонд	1213	439 270	369 132
32	Фонды переоценки статей баланса	1214	195 455	195 463
33	Накопленная прибыль	1215	764 361	789 473
34	Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации		4 068 179	4 023 161
35	Доля неконтролирующих акционеров		-	-
36	ВСЕГО собственный капитал	121	4 068 179	4 023 161
37	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	28 882 987	29 829 663

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ о прибылях и убытках на 1 июля 2019 года

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»
(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2019 год	2018 год
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	1 043 844	1 003 430
2	Процентные расходы	2012	429 910	385 331
3	Чистые процентные доходы	201	613 934	618 099
4	Комиссионные доходы	2021	231 803	190 232
5	Комиссионные расходы	2022	77 681	71 525
6	Чистые комиссионные доходы	202	154 122	118 707
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	170	120
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	1 167	1 087
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	45 658	72 210
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	232	(3 211)
11	Чистые отчисления в резервы	207	240 835	245 330
12	Прочие доходы	208	35 205	29 678
13	Операционные расходы	209	389 973	357 246
14	Прочие расходы	210	26 822	28 358
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	192 858	205 756
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	26 202	36 685
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	166 656	169 071
18	Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц		5 798	-
19	Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц		-	-
20	ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)		172 454	169 071
21	Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации		172 454	169 071
22	Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке)		-	-

Председатель Правления В. М. Ананич

Главный бухгалтер И. П. Лысоковская

Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте www.belarusbank.by и в отделениях «Беларусбанка»

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 11.01.2019, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	Мядельское райпо, Минская область, г. Мядель, ул. 1 Мая, д. 2
Месторасположение предмета аукциона	**Минская обл., Мядельский р-н**
Предмет аукциона	
Здание магазина (633/С-10786, 144,8 кв. м). Адрес: **Занарочский с/с, д. Пронькри, 47А.** Сведения о зем. участке: пл. 0,0809 га, предоставлен на праве постоянного пользования для размещения здания магазина № 6. Ограничения прав – водоохранная зона оз. Нарочь	
Начальная цена с НДС 20 % – 9 500,00 бел. руб.	
Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок подписания договора купли-продажи:	15 рабочих дней после проведения аукциона.
Условия оплаты предмета аукциона	
Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи	
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by	
Предыдущие извещения о проведении аукционов опубликованы в газете «Рэспубліка» от 09.07.2019	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.	
Дата и время проведения аукциона: 24.09.2019 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 23.09.2019 до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by	

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 17 октября 2019 года проводит 17-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номер лота	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
206	Грузовой бортовой КамАЗ-43101, ш. 0011755, дв. 0576619 VIN 421010L0011755 1990 г., 4 кат., 14 384 км	г. Береза, в/ч 23324	8 000,00	1 600,00
207	Грузовой бортовой КрАЗ-260,, ш. М0706201, дв. 20923, 1991 г. 4 кат., 61 184 км	г. Береза, в/ч 23324	8 400,00	1 680,00
208	Специальный автомобиль Урал-375А с кузовом-фургоном К-375 в составе: Кузов-фургон К-375 № 02062 1978 г. 2 кат., Автошасси Урал-375А, ш. 263604, дв. 545904 1978 г. 3 кат., 1 401 км	г. Гомель, в/ч 01313-Г	7 700,00	1 540,00
209	Специальный автомобиль ГАЗ-66-14 с кузовом-фургоном К-66Н в составе: Кузов-фургон К-66Н № 242286 1987 г. 4 кат., Автошасси ГАЗ-66-14, ш. 0512436, дв. 194762 1987 г. 4 кат., 2557 км	г. Осиповичи, в/ч 01313	3 000,00	600,00
210	Специальный автомобиль Урал-375 с кузовом-фургоном К-375 в составе: Кузов-фургон К-375 № 10497 1979 г. 4 кат., Автошасси Урал-375, ш. 310854, дв. 011733 1979 г. 3 кат., 7 153 км	г. Осиповичи, в/ч 01313	6 500,00	1 300,00
211	Специальный автомобиль ГАЗ-66-15 с кузовом-фургоном КФ-1МП в составе: Кузов-фургон КФ-1МП № 82011108, 1988 г. 4 кат., Автошасси ГАЗ-66-15, ш. 0561610, дв. 22127-91, 1988 г. 4 кат., 2 655 км	г. Осиповичи, в/ч 01313	3 200,00	640,00
212	Специальный автомобиль Урал-375 с кузовом-фургоном К2-375 в составе: Кузов-фургон К2-375 № 020235 1982 г. 2 кат., Автошасси Урал-375, ш. 390203, дв. 753423 1982 г. 3 кат., 2 114 км	г. Гомель в/ч 01313-Г	7 700,00	1 540,00
213	Специальный автомобиль ГАЗ-66-15 с кузовом-фургоном КФ-1МП в составе: Кузов-фургон КФ-1МП № 72841087 1987 г. 2 кат., Автошасси ГАЗ-66-15, ш. 0518779, дв. 236624 1987 г. 3 кат., 2 067 км	г. Гомель, в/ч 01313-Г	3 400,00	680,00
214	Специальный автомобиль ГАЗ-66-15 с кузовом-фургоном КФ-1МП в составе: Кузов-фургон КФ-1МП № 65050126 1988 г. 2 кат., Автошасси ГАЗ-66-15, ш. 0463843, дв. 159316 1986 г. 3 кат., 497 км	г. Гомель, в/ч 01313-Г	3 400,00	680,00
215	Специальный автомобиль ГАЗ-66-15 с кузовом-фургоном КФ-1МП в составе: Кузов-фургон КФ-1МП № 80028888 1988 г. 2 кат., Автошасси ГАЗ-66-15, ш. 0549740, дв. 169315 1988 г. 3 кат., 361 км	г. Гомель, в/ч 01313-Г	3 400,00	680,00
216	Специальный автомобиль ГАЗ-66-15 с кузовом-фургоном КФ-1МП в составе: Кузов-фургон КФ-1МП № 80061888 1988 г. 2 кат., Автошасси ГАЗ-66-15 ш. 0549578, дв. 1681731988 г. 3 кат.1 138 км	г. Гомель, в/ч 01313-Г	3 400,00	680,00
217	Специальный автомобиль ГАЗ-66-15 с кузовом-фургоном КФ-1МП в составе: Кузов-фургон КФ-1МП № 81082108 1988 г. 2 кат., Автошасси ГАЗ-66-15 ш. 0554883, дв. 2034471988 г. 3 кат., 391 км	г. Гомель, в/ч 01313-Г	3 400,00	680,00

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, **17 октября 2019 г. в 10.30.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы **до 15.00 14 октября 2019 года.**

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться 17 октября 2019 г. с 9.00 до 9.45.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY51BPSB30121078830299330000, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-СберБанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18, корп. 1, код BPSBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России, г. Москва, № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России № 30101810400000000225, **без НДС. Справки по тел./факс: (017) 398 05 41.**

Пралог да другога тысячагоддзя

Грандыёзным шоу «Міленіум», маляўнічым карнавалам, парадам аркестраў і дзясяткамі іншых мерапрыемстваў адсвяткаваў Брэст свой юбілей



Брэст гуляў тры дні. Яго насельніцтва ў мінулыя выхадныя, паводле некаторых падлікаў, павялічылася амаль на чвэрць за кошт шматлікіх гасцей, турыстаў. Не падвяло надвор'е, усе дні былі сонечныя, цёплыя, але не гарачыя. Здавалася, прырода лагодна ўсміхнулася брастаўчанам: гуляйце напоўніцу, святкуйце сваё тысячагоддзе.

І галоўнае, што сваю тройчы круглую дату абласны цэнтр сустрэў у абноўленым, памаладзелым выглядзе. Як той казаў, не сорамна было і гасцей клікаць. Гэты факт адзначыў і кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, які прыехаў павіншаваць гараджан у першы дзень святкаванняў. Прыгажосць, чысціню і парадак адзначалі таксама шматлікія госці. Пра гэта гаварылі нават у грамадскім транспарце, бо абсалютная большасць пасажыраў у суботу з мікрараёнаў накіроўвалася ў цэнтр горада, дзе было найбольш святочных пляцовак. На пешаходнай вуліцы Савецкай, вуліцы Гогаля сапраўды атрымаўся горад-свята. Тут цягнуліся рады гандляроў, рамеснікаў, тых, хто прадстаўляў народную творчасць, на імправізаваных сцэнах выступалі розныя калектывы, працавалі выязныя студыі беларускіх тэлеканалаў.

А ў поўдзень загучалі званы Свята-Мікалаеўскай брацкай царквы і іншых храмаў горада. У названым храме службу здзейсніў архіепіскап Брэсцкі і Кобрынскі Іаан.

— Мы з'яўляемся ўдзельнікамі вялікай гістарычнай падзеі — святкуем тысячагоддзе нашага горада, — сказаў, звяртаючыся да прысутных, уладыка. — На ўсіх нас ляжыць вялікая адказнасць за тое, які горад мы пакінем нашчадкам. Мы не павінны спыняцца на дасягнутым. Трэба імкнуцца да таго, каб даць добры імпульс будучыні. Мы не павінны забываць пра духоўнае развіццё нашага народа, жыхароў гэтага горада, усіх нас, таму што менавіта духоўны пачатак — аснова ўсіх асноў. Дарагі горад Брэст! Будзь мудры, будзь мірны, будзь цярплівы і працуй для таго, каб твае жыхары радаваліся і ўдасканальваліся духоўна, — павіншаваў прыхаджан і гасцей святар.

Пра духоўныя традыцыі на гэтым святкаванні не забывалі. Варта сказаць, што самае першае юбілейнае мерапрыемства адбылося ў новым тэатры лялек. Гэта быў міжнародны дзіцячы фестываль тэатраў і кніг «Кніжны шкап». У праграме яго знайшлі месца аж 30 спектакляў па дзіцячых кнігах і 70 літаратурных і культурных імпрэз. Ды і прайшоў ён у знакавым для Брэста месцы — лялечным тэатры, будынак якога ўзвялі да юбілею замест старога.

Ну а на вуліцы Савецкай шмат увагі аддавалася народным традыцыям і народнай творчасці. Тут знайшлося месца і музею «Бездзежскі фартушок», і маларыцкім народным строям. А ткацтва прадстаўляла вядомая маларыцкая майстрыха Сцепаніда Сцепанюк. Яна ж давала майстар-класы па прадзенні пад свае любімыя народныя песні. Шмат гледачоў сабраў дэфіле-паказ касцюмаў Брэсцкай вобласці «Модны стыль — народны тэкстыль».

Наогул пешаходная вуліца Савецкая, мусіць, ніколі раней не змяшчала столькі людзей адначасова. Не пакідала ўражанне, што па ёй рухаецца суцэльны людскі паток. Адзін разгублены рамеснік паразважаў услых: «Цікава, дзе ўсе гэтыя людзі жывуць і падсілкоўваюцца? Нашых кавярняў, пэўна, не хопіць». Але ж большасць з іх яўна былі брастаўчане, проста ў гэты дзень яны адарваліся ад камп'ютараў і тэлевізараў, не паехалі на дачы і прыйшлі пасвяткаваць разам з горадам.

Бо хіба ж можна было прапусціць, напрыклад, маляўнічы карнавал?! Яго калона расцягнулася прыблізна на тры кіламетры. Пачыналася шэсце ад бульвара Касманаўтаў, а фінішавала на плошчы Леніна. Карнавал на Дзень горада праходзіў у нас і раней, але гэты аказаўся асабліва шматлікі і яркі. У ім удзельнічалі госці з Расіі, Польшчы, Казахстана, Малдовы. Былі ўдзельнікі ад прадпрыемстваў і арганізацый Брэста. Кожны прадставіў сваю цікавую сцэнку альбо дэфіле на пэўны сюжэт. Напрыклад, «Брэсцкае марожанае» ў цэнтр пастаноўкі вывела вялікага белага мядзведзя, якога ўсе ведаюць па абгортцы пламбіра «Цімоша». Кампанія «Санта-Брэмар» праехала па карнавальным шляху на вялікім караблі з лагатыпам тысячагоддзя на ветразях, а гармата пры гэтым выдавала магутны феерверк з сярэбраных канфеці. Парадаваў тэатр жывых скульптур «Ларчык» пад кіраўніцтвам Віталя Ларчыка. Да гэтага ён упрыгожваў святкаванні на Савецкай, а на карнавале прадставіў прыгожую легенду XV стагоддзя пра гарадскога трубача. На вуліцы ж Леніна карнавал перадаў эстафету артыстам, якія падрыхтавалі канцэрт.

Тым часам усё болей людзей збіралася ў раёне вяслярнага канала, дзе было заяўлена асноўнае мерапрыемства святкавання — шоу «Міленіум». Брэст дакладна раней не бачыў такога ўзроўню і маштабу дзеі, — знаўцы кажуць, што і Беларусь таксама. Ну, па-першае, гэта сцэна вышынёй з пяціпавярховы дом, якая ўяўляла сабой цэлы комплекс канструкцый, прывезеных з Польшчы, Беларусі і Расіі. У пастаноўцы выкарыстоўвалі ваду, святло і музыку. Увасобленая ў жыццё смелая ідэя аўтарскай групы, несумненна, вартая захаплення. Музычна-гістарычную кампазіцыю паставілі галоўны рэжысёр Анжаліка Мікульская, рэжысёр-пастаноўшчык Марыя Траццякова, харэограф-пастаноўшчык Яўгенія Чарношава, музычнае суправаджэнне напісаў кампазітар Леанід Шырын.

Паводле некаторых падлікаў, паглядзець шоу прыйшло каля 70 тысяч чалавек. А калі ўлічыць, што прамая трансляцыя вялася па тэлебачанні і ў інтэрнэце, то гледачоў набярэцца сотні тысяч.

І было што паглядзець, трэба сказаць. Канцэрт «Міленіума» складаўся з 16 эпізодаў і расказаў пра гісторыю горада ад сярэднявечча да нашых часоў, пра галоўныя падзеі, людзей. На вачах гледачоў горад будаваўся, ваяваў з захопнікамі, абараняўся, атрымліваў магдэбургскае права, праводзіў кірмашы, шмат працаваў, ваяваў у апошнюю вайну. Найноўшыя тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца сёння ў шоу, дазволілі стварыць эфект пагружэння ў тую ці іншую рэальнасць. Было цікава, калі сучасныя дыктары тэлебачання ў вобразах сваіх калег кожнага з пасляваенных дзесяцігоддзяў паведамлялі пра нейкае дасягненне горада, а з дапамогай экраннай хронікі і сучасных эфектаў яно ўвачавідкі праходзіла перад гледачамі.

Часткай прадстаўлення сталі рэальныя брэсцкія маладажоны, якія прамовілі словы любові і вернасці перад такой аграмаднай аўдыторыяй. Дарэчы, у дні святкаванняў шлюб узялі 64 пары — гэта нашмат больш, чым у звычайныя выхадныя дні.

У канцэрце ўдзельнічалі сотні артыстаў. Для брастаўчан выступалі Іна Афанасьева, Алёна Ланская, Іван Вабішчэвіч, Тэа, Naviband. Кампазітар, народны артыст Беларусі Эдуард Ханок напісаў да юбілею песню пра Брэст і выступіў з ёй.

Адным з апошніх эпізодаў «Міленіуму» стала клятва, якую ад імя брастаўчан зачытаў ганаровы грамадзянін Мікалай Кузьміч. «Сёння мы пішам першыя радкі ў кнізе другога тысячагоддзя Брэста. Няхай наступнае пакаленне, якое зазірне ў гэтую кнігу, прачытае ў ёй нашыя любоў і адданасць роднаму гораду», — гаворыцца ў тэксце клятвы.

Завяршылася шоу маляўнічым феерверкам, які працягваўся каля 15 хвілін.

Мерапрыемстваў за тры дні было багата. Пра ўсе не раскажаш у адным газетным артыкуле. Заслугоўваюць увагі, несумненна, і парад аркестраў, на які сабраліся сотні музыкантаў з розных краін, і брэсцкі паўмарафон, што аб'яднаў аматараў бегу, і фестываль «Белая вежа», які пачаўся ў нядзелю, але трошкі растварыўся за мноствам розных мерапрыемстваў і культурных падзей. Думаю, што адсвяткавалі годна. І ўсё ж галоўнае, на мой погляд, у гэтым юбілеі тое, што застаецца. Новыя масты, новы тэатр, абноўлены гарадскі сад, прыгожая набярэжная, многа-многа пасаджаных дрэў ды іншае, што з'явілася для камфортнага жыцця брастаўчан. Цяпер важна не зніжаць планку, падтрымліваць і развіваць горад далей.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота БелТА.

СПАДЧЫНА ПЕРАТВАРАЕЦЦА... У ІНВЕСТЫЦЫЙНЫ ПРАЕКТ

У Івацэвічах прадэманстравалі, як раскрыць камерцыйны патэнцыял рэгіёнаў

Тэндэнцыя апошняга часу — развіццё брэндаў. І найбольшы плён у гэтай справе дае зварот да гісторыка-культурнай спадчыны. У народзе кажуць: што ні край, то звычай. У кожнай мясцовасці — свая ўнікальнасць, якая чакае раскрыцця. Як «раскрыць» адметнасці і зрабіць іх прыцягальнымі для турыстаў? Як развіць брэнд? Што прадугледжвае крэатыўны дыялог? Адказы знайшлі ў Івацэвічах — горадзе, які нядаўна маштабна адсвяткаваў 500-гадовы юбілей.

Менавіта тут падчас праекта «Капітал месца», арганізаванага Асацыяцыяй абароны інтэлектуальнай уласнасці «БелБрэнд» пры падтрымцы Івацэвіцкага райвыканкама і Пасольства Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь, юныя даследчыкі і актывісты з усёй Беларусі падчас каворкінгу абменьваліся ідэямі, прапаноўвалі шляхі развіцця брэндаў на аснове гісторыка-культурнай спадчыны.

Івацэвіцкі раён мае відавочную прыцягальнасць з пункту гледжання стварэння новых брэндаў — як нацыянальных, так і з міжнародным значэннем. Упершыню ў пісьмовых крыніцах Івацэвічы згадваюцца пад 1519 годам: у Літоўскай метрыцы ёсць акт аб перадачы гарадзенскім купцам за даўгі «маёнтка Івачэвічы». Рэгіён, багаты гісторыяй, славіцца і сусветна вядомымі асобамі. Тут у фальварку Марачоўшчына, што недалёка ад Косава, нарадзіўся Тадэвуш Касцюшка, знаны палітычны і ваенны дзеяч Рэчы Паспалітай. Пакінуў свой след тут кампазітар, паэт, мецэнат, дзяржаўны дзеяч ВКЛ Міхал Агінскі: па яго ініцыятыве і на яго сродкі быў пабудаваны канал, які злучыў басейны Чорнага і Балтыйскага мораў, — дарэчы, гэта самы стары беларускі канал. Гэтая зямля зведала падзеі паўстання Кастуся Каліноўскага (1863—1864). Ну і вядома, непераўзыдзеная перліна рэгіёна — Палац Пуслоўскіх, рэстаўрацыю якога плануюць скончыць да 2020 года (а да 1 кастрычніка бягучага года будуць здадзены ў эксплуатацыю гасцініца і кавярня палаца).

— У Івацэвіцкім раёне жылі асобы, вядомыя ўсяму свету, — адзначыла а**ўтар ідэі праекта, намеснік старшыні Асацыяцыі абароны інтэлектуальнай уласнасці «БелБрэнд», кіраўнік Дэпартамента інавацыйных праектаў Валянціна ДЫНІЧ.** — Асноўная ідэя праекта «Капітал месца» — каб багацце беларускай зямлі рабілася вядомым, запатрабаваным не толькі намі, але і ва ўсім свеце, бо ў нас ёсць чым ганарыцца.

— Нягледзячы на тое, што гораду Івацэвічы ўжо 500 гадоў, сусветная суполка яшчэ мала ведае пра магчымасці і таленты, якія горад гатовы прадставіць свету, — мяркуе віцэ-старшыня Еўразійскай творчай гільдыі (Лондан), дырэктар выдавецтва Hertfordshire Press Марат Ахмеджанаў, які быў запрошаны ў экспертны савет каворкінгу. — Мы як грамадская арганізацыя аб'ядноўваем творчых асоб па ўсім свеце і будзем рады дапамагчы выкарыстаць вопыт, які ёсць у Вялікабрытаніі, па прасоўванні лакацый. А ў Вялікабрытаніі любы горад — брэнд: Сэндвіч, Чэдэр, Тэлэстэр, Уінчэстэр зрабілі вялікі ўнёсак у гісторыю. Упэўнены, што ў Івацэвіч вялікая будучыня ў гэтым плане, таму будзем вам дапамагаць.

— Мы часам недастаткова выкарыстоўваем патэнцыял роднай зямлі, каб прасоўваць сябе, праекты, ідэі, — мяркуе Валянціна Дыніч. — Прыклад: Чайкоўскі нарадзіўся ў Воткінску (Удмуртыя). Думаеце, ва Удмуртыі ёсць што-небудзь, што нагадвае пра Чайкоўскага? А вось Моцарт — іншы вялікі класік музыкі — адзін з першых раскручаных брэндаў, і Аўстрыя ад яго атрымлівае вялікія грошы. Мастацтва і брэнд сёння — патэнцыял, які выкарыстоўваецца шырока, але часта не намі.

Цікавыя ідэі і распрацоўкі па развіцці брэндаў прэзентавалі ўдзельнікі каворкінгу «Капітал месца» — маладыя людзі з усіх абласцей краіны. Найбольш уразілі прадстаўнікі Брэсцкай вобласці. Так, максімальна выкарыстоўваць мясцовую спецыфіку для павышэння значнасці рэгіёнаў прапанавалі Станіслаў Ратахін і Юлія Якушава, вучні 9 класа сярэдняй школы № 3 Івацэвіч: яны стварылі вэб-сайт «Турыстычны даведнік. Івацэвіцкі край» (tourism.rooivacevichi.gov.by) і маюць на мэце папулярызаваць турыстычны патэнцыял рэгіёна. Адметнасць сайта — раздзел «Народныя ўмельцы», дзе папаўняецца картатэка майстроў Івацэвіцкага краю. Тут і лозапляценне, і ткацтва, і вышыўка, і ганчарства. Аўтары праекта разлічваюць, што сайт будзе дапамагаць адраджаць мясцовыя традыцыі і зробіць народныя рамёствы турыстычным брэндам малых вёсак. А такім чынам узнімаецца значнасць рэгіёнаў.

Станіслаў РАТАХІН і Юлія ЯКУШАВА распрацавалі вэб-рэсурс па прасоўванні Івацэвіцкага краю.

Адмысловы праект Станіслава і Юліі ўжо знайшоў зваротную сувязь. Старшыня Івацэвіцкага райвыканкама Аляксандр Грыцук прапанаваў юным даследчыкам супрацоўніцтва: вырашыць з дапамогай сайта задачу па пошуку арандатара для аб'ектаў палаца Пуслоўскага.

Мікіта Бянько, вучань 8 класа Косаўскай сярэдняй школы, зацікавіўся развіццём робататэхнікі. Для набыцця практычных навыкаў у асваенні робататэхнікі ў сваім праекце «Праграмаванне Arduino» Мікіта прапануе выкарыстоўваць электронную мантажную плату Arduino. З яе дапамогай можна ствараць і кіраваць рознымі прыладамі, такімі як датчыкі руху, тэмпературы, ціску. Arduino — інструмент для праектавання электронных канструкцый, які ўзаемадзейнічае з навакольлем больш шчыльна, чым персанальныя камп'ютары.

— Гэты каворкінг — не проста стартап-праекты, — яны накіраваны на тое, каб прыдумаць, як іх прасунуць з акцэнтам на беларускасць, — заўважае Валянціна Дыніч. — Мы шукаем, чым адметны пэўны рэгіён. У Шчучыне, напрыклад, ёсць асаблівая кадрыля, якая ўнесена ў Спіс сусветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, ды ці танцуюць яе ў Шчучыне? А на гэтай глебе можна было б арганізаваць чэмпіянат танцаў...

Ідэй для прасоўвання рэгіёнаў можа быць шмат, лічыць Марат Ахмеджанаў і прыводзіць у прыклад брытанскі вопыт: «Дзіўна, але краіна, дзе няма пляжаў, дзе ўсё дорага, дзе туманы і дажджы, прымае больш чым 36 мільёнаў турыстаў у год. Гэта больш, чым Тайланд, Малайзія ці іншыя краіны. У Францыі ёсць Сэн-Трапэ, Блакітны бераг, Альпы — у Англіі гэтага няма. Але самы галоўны яе інструмент — культура, гісторыя. Чаго каштуе адзін Уільям Шэкспір! Музей Шэкспіра ў год наведвае 250 тысяч замежных турыстаў. Улічым, што ён знаходзіцца ў невялікім гарадку за 50 кіламетраў ад Лондана — і едуць спецыяльна дзеля Шэкспіра. А фестываль Чарльза Дыкенса! Няма тых, хто не чуў пра выбітных асоб Англіі: Джэйн Осцін, Артур Конан Дойль, Байран... Гэта ўсё брэнды — тое, што прыносіць краіне грошы. Creative media (музеі, канцэрты, забаўляльная сфера; турызм сюды не ўваходзіць) дае краіне 12 % ВУП. Трэба выкарыстоўваць гэты вопыт». Старшыня Еўразійскай творчай гільдыі згадаў гісторыю Леона Бакста. Мастак, стваральнік дэкарацый, тканін Леон Бакст родам з Гродна. Ён быў выбітнай асобай свайго часу. Аднойчы пасля вайны, у 1946 годзе, амерыканец Джым Томпсан ляцеў з Нью-Ёрка ў Тайланд, і яму падарылі кнігу з работамі Леона Бакста. У Тайландзе ён убачыў, што там развіта вытворчасць тканін з шоўку. Ён вырашыў скарыстаць малюнкі Леона Бакста для гэтых тканін. Першае, што было тады запатрабавана, — гальштукі. І гэта становіцца паспяховым брэндам. «Брэнд Джыма Томпсана — адзін з самых папулярных і дарагіх у свеце. 80 % патэнтаў створана на мастацтве Леона Бакста. Цяпер гэта заводы па вытворчасці керамікі, мэблі, тканін, сумачак, вопраткі, — расказвае Марат Ахмеджанаў. — Вось так: нарадзіўся і вырас Бакст у Беларусі, пачаў тварыць у Санкт-Пецярбургу, праехаў увесь свет. На жаль, яго сям'я аўтарскія правы не ўзаконіла. Таму трэба развіваць творчасць выхадцаў з Беларусі, абараняць правы».

Звяртаючыся да магчымасцяў рэгіёна, Марат Ахмеджанаў задаўся пытаннем: што можна зрабіць у прасоўванні брэндаў для Івацэвіч? Мабыць, кожны адукаваны чалавек чуў пра Івана Грознага. А ці ведае хто, як звязаны Іван Грозны з Івацэвічамі? Аказваецца, наўпрост: яго маці Алена Глінская нарадзілася менавіта ў Івацэвіцкім раёне. Ці не варта скарыстацца гэтым для распрацоўкі брэнда?

Наталля СВЯТЛОВА.

Палац Пуслоўскіх, рэстаўрацыю якога плануюць скончыць да 2020 года (а да 1 кастрычніка 2019 г. ужо будуць здадзены ў эксплуатацыю гасцініца і кафэ палаца).

Запрашальнік

ДА КАЛАСКА І КАЛІНКІ

13—14 верасня склікае гасцей і ўдзельнікаў, аматараў смеху з прычыны трапных жартаў і прыхільнікаў народных спеваў і танцаў 9-ы Рэспубліканскі фестываль народнага гумару ў Аўцюках. Распачаўся ён з лёгкай рукі тутэйшага ўраджэнца, вядомага пісьменніка Уладзіміра Ліпскага яшчэ ў 1995-м — пасля выдання кнігі «Аўцюкоўцы», і з таго часу палюбіўся і аматарскім ды прафесійным калектывам, і гледачам розных узростаў.

Кожны раз у праграме вялікага свята, якое праводзяць Міністэрства культуры, Гомельскі аблвыканкам і Калінкавіцкі райвыканкам, з'яўляюцца нейкія сюрпрызы — то арганізатары здзяць уласныя «Алімпійскія аўцюкоўскія гульні», то абвесцяць пошук «Міс Аўцюкі» (абодва мерапрыемствы, дарэчы, пройдуць і сёлета). Разынкай жа фестывалю 2019 года абяцае стаць адкрыццё ў Калінкавіцкім раёне, дакладней, на шляху паміж Вялікімі і Малымі Аўцюкамі, памятнага знака «Аўцюкоўскі глобус».

13 верасня музычна-гумарыстычныя канцэрты пройдуць у розных населеных пунктах раёна: Вялікіх і Малых Аўцюках, Каплічах, Даманавічах, Бабровічах, Юравічах. А на наступны дзень ужо ў райцэнтры адбудзецца конкурс гумарыстаў «Як без вас жылі, раскажам, не пачуеце — пакажам». Будуць працаваць выстаўка стылізаванай аўтамотатэхнікі «Аўцюкоўскія драндулеты» і адмысловая «Фотасушка» ад газеты «Калінкавіцкія навіны», адбудзецца прэзентацыя турыстычных маршрутаў «Добра там, дзе нас няма», чакаюць наведвальнікаў імправізаваныя падворкі ўсіх сельсаветаў раёна, «Горад майстроў» і пляцоўка рамеснікаў, дзіцячая пляцоўка «Аўцюкоўскі ералаш». Упершыню для ўсіх ахвотных арганізуюць конкурс на найлепшае фота — «Гумар у фармаце сэлфі» і забаўны відэаролік — «Дзе мы не былі».

Уваход на фэст, як і раней, вольны, аднак «Аўцюкоўская мытня» традыцыйна патрабуе ў якасці білета арыгінальную прыпеўку ці анекдот, пажадана без «барады».

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Пантэон айчыны

Ілья Капіевіч
(1651—1714)

Ілья Капіевіч быў асветнікам, які шмат зрабіў для развіцця рускага кнігадрукавання, а вось на сваёй радзіме, у Беларусі, доўгі час быў амаль невядомы. Драматычныя падзеі перавярнулі яго лёс. Яшчэ ў дзевяцігадовым узросце ў 1660 годзе маскоўскі ваявода Хаванскі ўзяў яго ў палон і вывез у Масковію. Пазней Капіевіч згадваў, што шэсць гадоў быў «пад вялікім гасударом». Невядома, што ён меў на ўвазе, — магчыма, сваё пражыванне пры царскім двары. Не выключана, што Ілья вучыўся ў Сімяона Полацкага. Зрэшты, у 1666 годзе ён вярнуўся на Беларусь, дзе яго чакала вялікае расчараванне. Родавы маёнтак канфіскавалі на карысць езуітаў на той падставе, што бацька Ілы быў ерэтык (пратэстант) і здраднік — перайшоў на бок рускага цара. Юнак застаўся без сродкаў для існавання. Трэба было шукаць сваё месца ў жыцці. Капіевіч выбраў не вайсковае прызванне, а асвету. Вучыўся ў Слуцкай кальвінскай гімназіі, пасля працягваў навучанне ў рэфармацкай школе ў Амстэрдаме, стаў кандыдатам-пастарам Амстэрдамскага збору. Ужо тады Капіевіч думаў заняцца выдавецкай дзейнасцю і прасіў парады ў лістах да знакамітага нямецкага філосафа і навукоўца Готфрыда Вільгельма Лейбніца. Што параіў яму мэтр, невядома, але сваю задуму Капіевіч змог ажыццявіць. Паспрыяў гэтаму прыезд у 1697 годзе ў Галандыю рускага пасольства, у якім знаходзіўся і цар Пётр I. Капіевіч выкладаў мовы членам пасольства і гэтак пазнаёміўся з царом. Жвавы, эрудзіраваны чалавек, а тым больш той, які жыў раней у Маскве і ведаў рускую мову, стаў каштоўнай знаходкай для цара. Пётр I прапанаваў Капіевічу пісаць для асветы яго падданых «математические, геометрические, архитектонские и ратные земные и морские книги и прочие всякие художние». Пэўна, гаворка ішла пра пераклады на рускую мову галандскіх кніг. Гэта была высакародная справа, пра якую ён марыў, таму з радасцю пагадзіўся. «Ничто же полезнейшее есть в сем знатии, как познание и умелость писмен. Сие приношает величество и славу, сие неизреченую красоту воздает, сие государство укрепляет, и расширяет, и прославляет — всякому человеку во всяком чине полезно. Письмена разум исправляют, и обучают, и утешают», — так Ілья Капіевіч разумеў прызначэнне кніг.

За год напружанай працы Капіевіч пераклаў «Морского плавания книгу» аўтара Дзеграфціра, якую суправадзіў адмысловымі чарцяжамі. Цар заплаціў толькі за пераклад, а вось выданне яго даручыў галандцу Яну Тэсінгу, надаўшы яму манапольнае права друкаваць рускія кнігі і распаўсюджваць іх у Масковіі. Склалася дзіўнае становішча. У Тэсінга не было кірылічнага шрыфта, таму ён і сам не друкаваў рускія кнігі, і не даваў гэта зрабіць Капіевічу. Давялося Капіевічу кланяцца Тэсінгу, рабіць шрыфт і ўжо разам з ім выдаваць свае кнігі. У 1699 годзе ў друкарні Тэсінга выходзяць адразу тры кнігі Капіевіча: «Введение краткое во всякую историю», «Краткое и полезное руководение во аритметику», «Уготование и толкование ясное поверстания кругов небесных» — падручнікі па гісторыі, арыфметыцы і астраноміі. Аўтар пісаў пра тое, што даўно было вядома культурнай Еўропе, але каб стала вядома і ў Масковіі, трэба было пераканаць маскавітаў у патрэбнасці і карысці ведаў. Вось як Капіевіч тлумачыць прызначэнне гісторыі: «История же память утверждает и деяния древняя, или дела ветхая всяческая прешедшего времени, яко настоящего, изъявляет, да познает и не забывали всяк род».

Аднак, як высветлілася, кнігі Капіевіча былі непатрэбныя. Падрыхтаваныя да друку рукапісы, «аки безделицу какую», вярнуў назад пад'ячы, здзекліва мовіўшы: «У нас-де промышленных людей на Москве стегают!» А вучні не сказалі за вучобу дзякуй, а скралі чатыры ягоныя глобусы.

У наступным 1700 годзе Тэсінг выдаў ажно пяць кніг Капіевіча. Гэта і слоўнікі (руска-лацінска-нямецкі і руска-лацінска-галандскі), і лацінская граматыка, і пераклады Эзопавых баек і фрагмента з кнігі Льва Міратворца пра ваеннае мастацтва.

1	Благоустройство территории с инвентарным номером 700/С-106076, общей площадью 3 495,5 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ш. Славгородское, территория ш. Славгородское, 159	40 320 р. 00 к.	4 032 р. 00 к.	Благоустройство территории состоит из: асфальтобетонное покрытие площадью 2 678,3 кв. м., бордюр бетонный длиной 29,65 м; бетонное покрытие площадью 817,2 кв. м., бордюр бетонный длиной 153,25 м; ограждение металлическое длиной 22,5 м; ворота металлические	Без условий

Начальная цена снижена на 50 %.

Аукцион состоится 23 сентября 2019 года в 15.00 в здании Могилевского городского исполнительного комитета по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.

Заявки принимаются ежедневно с 11 сентября 2019 г. в рабочие дни с 8 до 17 часов (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.

Последний день приема заявлений и внесения задатка – 20 сентября 2019 года до 13.00. Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.

Заключительная регистрация участников аукциона **23 сентября 2019 года** с 14.00 до 15.00

Продавец: ОАО «Торговое автопредприятие», 212030, г. Могилев, Славгородское шоссе, 159, контактные телефоны — (80222) 46-70-82, 8-044-727-30-44 (вел.).
Организатор аукциона — МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, контактные телефоны — (80222) 42-25-64, 42-24-59, 8-029-15-15-444.
Аукцион проводится в соответствии с порядком проведения открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Торговое автопредприятие».
Недвижимое имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000007005014, площадью 1,0236 га, назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений.
Лица, желающие принять участие в аукционе, не позднее срока, указанного в извещении о проведении аукциона, подают заявление на участие в аукционе, подписанное с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон, заявление об ознакомлении с объектом, к которым прилагаются:
-**документ, подтверждающий внесение суммы задатка** на расчетный банковский счет организатора аукциона — МГ УКП «Центр по приватизации» BY66BLBB30120700008710001001 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, код BLBBBY2X, УНН 700008710 с отметкой банка;
- **юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;
- иностранным юридическим лицом — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;
- **иностранным индивидуальным предпринимателем** – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;
- представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленным законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);
- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность:
- представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).
Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан в установленном порядке возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.
Договор купли-продажи заключается продавцом и победителем аукциона (единственным участником аукциона) в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.
Условия и порядок оплаты – оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета аукциона производится в течение 10 банковских дней с момента заключения договора купли-продажи, с возможностью рассмотрения предоставления рассрочки.
С объектом можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 8 до 17 часов, предварительно согласовав время с продавцом.
В предусмотренных законодательством случаях уплачивается штраф организатору аукциона в течение одного месяца в размере 100 базовых величин: **победителем аукциона** — в случае, если он в установленный срок не подписал протокол о результатах аукциона, не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона, не подписал договор купли-продажи предмета аукциона; **лицом, приравненным к победителю аукциона** — в случае его отказа (уклонения) от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и (или) подписания договора купли-продажи предмета аукциона; **участниками аукциона –** в случае их отказа объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным.
Полная информация о выставленном на аукцион объекте недвижимости опубликована в газете «Звязда» № 120 (28987) от 28 июня 2019 г.
Контактные телефоны организатора аукциона для уточнения и получения дополнительной информации: (80222) 42-25-64, 42-24-59, 8-029-15-15-444.

ПАЧУЦЬ... КОЛЕРЫ

Як у Беларусі агучваюць фільмы і спектаклі для невідушчых

Чалавек жыве не хлебам адзіным і, калі задаволеныя асноўныя фізіялагічныя патрэбы, жадае рэалізацыі ў іншых сферах — спасцігаць свет, знайсці сваё месца ў грамадстве, далучыцца да культуры і гістарычнай спадчыны... Добра разважаць пра гэта, калі адчуваеш наваколле напоўніцу, без межаў і перашкод. Калі ж гаворка ідзе пра людзей з абмежаванымі магчымасцямі, ім усё даецца нашмат больш складана. Напрыклад, ці магчыма паказаць кіно альбо карціну невідушчаму? Аказваецца, невідушчы глядач — гэта зусім не аксюмаран, а хоць і складаная, але цікавая, высакародная і вельмі патрэбная задача, якую выконваюць ціфлакаментатары.

ДАСЬЕ «ЗВЯЗДЫ»

Аўдыядэскрыпцыя (або ціфлакаментаванне) — лаканічнае апісанне прадмета, прасторы альбо падзеі, незразумелых людзям з глыбокімі парушэннямі зроку і цалкам невідушчым без спецыяльных слоўных тлумачэнняў. Развіццё гэтага кірунку, які стаіць на мяжы сацыяльнай і культурнай сфер, ішло паралельна на Захадзе і ў СССР, таму і з'явіліся два розныя тэрміны для адной з'явы. Зрэшты, азначэнне «ціфлакаментаванне» спецыялісты лічаць больш шырокім: калі аўдыядэскрыпцыя прадугледжвае толькі гукавое апісанне візуальнага рада і дзеяння — у кіно, тэатральных пастаноўках, спартыўных спаборніцтвах, — дык ціфлакаментаванне датычыцца і пісьмовых, і друкаваных крыніц — карцін, фотаздымкаў, геаграфічных картаў, чарцяжоў і г. д.

Дарэчы, на сёння, па звестках РГА «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку», у Беларусі налічваецца каля 20 тысяч інвалідаў па зроку I і II груп — людзей з цяжкімі формамі парушэння зроку.

Нягледзячы на тое, што першымі ўзорамі ціфлакаментавання можна лічыць радыётрансляцыі, напрыклад, спартыўных матчаў, якія ў СССР распачаліся яшчэ з канца 1920-х, спецыяльныя «гукафільмы» з тлумачэннямі для невідушчых пачалі з'яўляцца толькі праз паўстагоддзя. Першы метадычны дапаможнік для бацькоў, у якіх растуць невідушчыя дзеці, выйшаў толькі ў 1989 годзе, а інструкцыйны дапаможнік для спецыялістаў — усяго 10 гадоў таму.

Для параўнання: у ЗША 25 кабельных тэлеканалаў абавязаныя змяшчаць у квартальнай праграме не менш чым 50 перадач, якія суправаджаюцца аўдыядэскрыпцыяй. У Францыі закон абавязвае 10 асноўных вяшчальнікаў кожны тыдзень паказваць па дзве перадачы з аўдыядэскрыпцыяй. У Германіі з 1998 года гэтым займаецца арганізацыя Deutsche Horfilm gemeinnutzige GmbH (між іншым афіцыйны партнёр Берлінскага кінафестывалю), што спецыялізуецца на фільмах, спектаклях, музейных экспазіцыях ды фестывалях і агучвае для невідушчых каля 100-110 кінастужак штогод, прычым 20 % з іх — пры дзяржаўным фінансаванні. У суседняй Расіі ціфлакаментаванне актыўна падтрымлівае канцэрн «Масфільм», які змясціў на сваім YouTube-канале дзясяткі сваіх фільмаў мінулых гадоў, агучаных для невідушчых людзей. У Расіі на сёння больш за 50 прафесійных ціфлакаментатараў, сярод якіх, напрыклад, актрыса Ірына Бязрукава. А што ў нас?

У Беларусі піянеры ціфлакаментавання — сацыяльна-культурная ўстанова «МоцАрт», якая рэалізавала ўжо мноства інклюзіўных праектаў для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. «Мы ставім перад сабой дзве асноўныя задачы, — расказвае **дырэктар «МоцАрта» Алесь КАЛОША,** — гэта інклюзія, рэабілітацыя людзей з інваліднасцю, і падтрымка і развіццё нацыянальнай культуры».

«Акрамя пандусаў, афарбаваных прыступак і тактыльных плітак, людзі з глыбокім парушэннем зроку маюць патрэбу ў далучэнні да культуры, прычым у даступных фарматах, — падкрэслівае Алесь Калоша. — Разам з дзяржавай мы стараемся адаптаваць да іх магчымасцяў найлепшыя ўзоры беларускай нацыянальнай і сусветнай культуры. Хачу паведаміць усім

вельмі добрую навіну: мы заключылі з кінастудыяй «Беларусьфільм» дагавор, паводле якога ўсе агучаныя намі фільмы, адаптаваныя для людзей з інваліднасцю па зроку, будуць змешчаныя на YouTube-канале нацыянальнай кінастудыі».

Дарэчы, гэта ўжо сёмы фільм з аўдыядэскрыпцыяй, якую здзейснілі супрацоўнікі «МоцАрт». Усяго ж маштабны праект «Бязмежнае кіно», які рэалізуецца сумесна з нацыянальнай кінастудыяй «Беларусьфільм», уключае 12 кінастужак — своеасаблівы «залаты фонд», склад якога вызначылі на кінастудыі да ўласнага 90-годдзя. З 2016 года ўжо былі паказаныя ў Мінску і іншых абласных цэнтрах фільмы «Горад майстроў», «У жніўні 44-га», «Дзікае паляванне караля Стаха», «Белыя росы», «Прыгоды Бураціна» і «Пра Чырвоную шапачку» — апошнія дзве карціны выклікалі суцэльнае захапленне ў вучняў 188-й сталічнай школы для дзяцей з парушэннямі зроку (некаторыя маленькія гледачы ўпершыню даведаліся, што Бураціна — драўляная цацка, а не ўяўны персанаж).

Асноўны ціфлакаментатар гэтых фільмаў — акцёр Уладзімір Лісоўскі, які за час работы і праходжання спецыяльных курсаў у Польшчы лепш зразумеў псіхалогію і асаблівасці светаўспрымання невідушчых людзей. Наогул працэс агучвання няпросты і няхуткі: кожны фільм патрабуе каля двух месяцаў працы і 400—500 долараў выдаткаў. Сцэнарысты аўдыядэскрыпцыі пераглядаюць кожную стужку, каб зрабіць хранаметраж і запоўніць паўзы апісаннем таго, што адбываецца ў кадры, але пры гэтым не «наехаць» на дыялогі герояў, музыку і так званыя «значныя шумы», потым ідзе ўласна агучванне, потым з дапамогай невідушчых тэсціроўшчыкаў удакладняюць, ці ўсё зразумела, ці трэба выправіць некаторыя хібы. Пры гэтым ціфлакаментатар мусіць не толькі мець выразную дыкцыю, моцны і прыемны голас, але і прытрымлівацца пэўных стандартаў: не даваць ацэнку эмоцыям герояў, не навязваць сваю ацэнку, не падаваць як адзіную правільную сваю версію, «што хацеў сказаць аўтар».

Як гэта зроблена

«Івану, падлетку гадоў 12, ручной машынкай састрыгаюць валасы. Арцём, светлавалосы хлопец гадоў 14, смяецца, галавой ківае ў бок партрэта з выявай лысага вайскоўца — Катоўскага. У Арцёма і Івана на валасах пена, яны ўмываюцца, мыюць галовы...»

(фрагмент аўдыядэскрыпцыі фільма «Вянок санетаў»)

— Праект «Бязмежнае кіно» стаў магчымы дзякуючы дасягнутай домоўленасці з «Беларусьфільмам» і падтрымцы старшыні Кастрычніцкага раённага аддзялення РГА «Белая Русь», кіраўніка гандлёвай кампаніі Максіма Крупейчанкі, для якога сацыяльная адказнасць бізнесу не проста прыгожыя словы, а неад'емная частка жыцця, — адзначае Алесь Калоша. — Планаў мноства — наперадзе яшчэ пяць кінастужак «Бязмежнага кіно», неўзабаве хочам зрабіць з Аленай Масла аўдыяверсію дзіцячай кнігі пра Лахнеску... На ўсё гэта, безумоўна, нашых рэсурсаў не хапае, хоць мы і спрабуем зарабляць: пішам аўдыякнігі па замовах і прадаём іх, але далёка не ўсе пра іх ведаюць. Таму, шчыра скажу, будзем удзячныя нераўнадушным прадстаўнікам бізнесу, грамадскім дзеячам за піярпадтрымку і дапамогу. Працаваць у гэтым кірунку безумоўна неабходна, бо патрэба ў людзей ёсць. Многія людзі з парушэннем зроку пасля першых нашых паказаў фільмаў з аўдыядэскрыпцыяй тэлефанавалі мне і прызнаваліся, што нарэшце, упершыню за шмат гадоў, зразумелі сутнасць фільмаў, тыя падрабязнасці і дэталі, якіх не бачна. Бо прыблізна зразумець сюжэт можна і на звычайным кінасеансе, але пасапраўднаму атрымаць асалоду ад фільма — канешне, аўдыядэскрыпцыя ў гэтым вельмі дапамагае.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота motsart.by.

Адзін з кірункаў работы ўстановы — падрыхтоўка аўдыякніг (у прыватнасці, выдадзены дзевяць аўдыякніг «Гродна: гісторыя ў гуку», у DAISY-фармаце выдадзена хрэстаматыя па гісторыі Беларусі для 8 класа — дадатак для падручніка, які па замове Міністэрства адукацыі быў надрукаваны шрыфтам Брайля для невідушчых дзяцей). У 2016 годзе пры непасрэдным удзеле супрацоўнікаў «МоцАрт» быў здзейснены сумесны беларуска-польскі праект «Развіццё тэхнік прыстасавання інфармацыі і мастацтва да патрэб невідушчых і глухіх. Аўдыядэскрыпцыя для невідушчых людзей у музеях, тэатрах і іншых установах культуры». У яго межах прайшлі спецыялізаваныя экскурсіі ў Нацыянальным мастацкім музеі (аўдыягід, падрыхтаваны для невідушчых наведвальнікаў, апісваў 25 карцін з музейнай экспазіцыі) і ў Доме-музеі Марка Шагала ў Віцебску (аўдыягід з шасцю трэкамі — апісаннямі самога дома-музея, лаўкі, пакоя хлопчыкаў, гасцёўні, чырвонай залы і кухні, а таксама падрыхтоўка некалькіх экспанатаў для тактыльнага агляду). Летась упершыню ў Беларусі адбыўся тэатральны спектакль з аўдыядэскрыпцыяй — невідушчыя гледачы змаглі «ўбачыць» у Купалаўскім тэатры пастаноўку «Школа падаткаплацельшчыка». У канцы мінулага года выпусцілі для невідушчых кнігу пра Ефрасінню Полацкую з унікальным дадаткам — тактыльнай іконай.

А літаральна на мінулым тыдні ў сталічным кінатэатры «Беларусь» адбылася прэзентацыя сумеснага праекта «МоцАрт» і РГА «Белая Русь» — бясплатны прагляд для людзей з парушэннем зроку мастацкага фільма «Вянок санетаў» з аўдыядэскрыпцыяй.

Як адзначыў перад пачаткам сеанса старшыня рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Генадзь Давыдзька, гэтая работа — «дэманстрацыя павагі адно да аднаго, дадатковая магчымасць для тых, каму выпаў няпросты лёс, адчуць жыццё і мастацтва ва ўсіх яго праявах». Больш за 150 гледачоў з парушэннямі зроку, слабым зрокам і невідушчых, якія прыйшлі на сеанс, змаглі не толькі «ўбачыць» тое, што адбывалася на экране, але і атрымалі падарункі — дыскі з фільмамі ў аўдыядэскрыпцыі, якія можна будзе перагледзець сям'ёй дома.

КАБ ПРАДУХІЛІЦЬ КРЫЗІС...

Рэспубліканскі цэнтр псіхалагічнай дапамогі адкрыўся ў Мінску. Звярнуцца сюды могуць вучні, іх бацькі і настаўнікі. Пры жаданні — ананімна.

Знайсці цэнтр нескладана. Размяшчаецца ён у адным з інтэрнатаў Студэнцкай вёскі на вуліцы Чурлёніса, 3. Працуе тут каманда з 10 чалавек — гэта навукоўцы і выкладчыкі Інстытута псіхалогіі БДПУ імя Максіма Танка, а таксама кваліфікаваныя практыкі. Кіруе цэнтрам Вольга МАЦЮХОВА, сямейны псіхолаг з 14-гадовым стажам.

— Сёння ў кожнай школе абавязковая прысутнасць педагога-псіхолага, які адказвае за псіхалагічнае здароўе дзяцей. Аднак рэсурсаў устаноў адукацыі ў крызісных сітуацыях часам недастаткова, таму адкрыццё Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі надзвычай актуальнае, — падкрэслівае **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА.**

Спецыялісты цэнтра будуць аказваць кваліфікаваную псіхалагічную дапамогу навучэнцам і студэнтам, бацькам і педагагічным работнікам, якія трапілі ў крызісныя сітуацыі. Пракансультуюць тут і бацькоў гіперактыўных дзяцей, а таксама настаўнікаў, якія сутыкнуліся з прафесійным выгараннем. Атрымаць дапамогу можна па тэлефоне 8-017-300-10-06, або асабіста прыйсці на кансультацыю. Працаваць з дзіцём ці дарослым будуць да таго часу, пакуль не выцягнуць яго з крызісу. Уся дапамога аказваецца бясплатна.

Для настаўнікаў, сацыяльных педагогаў, педагогаў-псіхолагаў з усёй краіны супрацоўнікі цэнтра плануюць праводзіць навучальныя семінары. Акрамя таго, для работнікаў устаноў адукацыі, дзяцей і бацькоў будуць распрацоўвацца метадычныя дапаможнікі, практыкумы, рэкамендацыі па стварэнні і падтрымманні бяспечнага адукацыйнага асяроддзя.

Шчыльнае ўзаемадзеянне Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі з рэгіянальнымі сацыяльна-педагагічнымі цэнтрамі забяспечыць своечасовае і прафесійнае рэагаванне на крызісныя падзеі на месцах.

У планах — прызначыць для кожнай вобласці краіны свайго супервізара. Чалавек з нязвыклай пакуль для слыху пасадай — гэта вопытны псіхолаг. У складаных сітуацыях да яго па параду змогуць звяртацца іншыя спецыялісты.

Адкрыццю цэнтра папярэднічала вывучэнне вопыту суседніх краін. У перспектыве плануецца наладзіць стажыроўкі беларускіх педагогаў і псіхолагаў за мяжой і запрашаць замежных спецыялістаў, для таго каб павысіць узровень аказання псіхалагічнай дапамогі.

Менавіта на базе факультэта псіхалогіі БДПУ збіраліся спецыялісты ва ўсіх крызісных сітуацыях — ад трагедыі на Нямізе да выбуху ў метро. Цяпер ёсць мэта — стварыць на базе цэнтра сістэму экстраннай дапамогі.

У кастрычніку ў цэнтра запрацуе свой сайт. Там будзе чат, дзе дарослыя і дзеці змогуць кругласутачна задаваць свае пытанні псіхолагам.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Яцэк ПАЛКЕВІЧ:

«Я СТАНУ ДОБРААХВОТНЫМ ПАСЛОМ БЕЛАРУСІ Ў ЕЎРОПЕ»

Славуты польскі падарожнік упэўнены, што сусед праз мяжу важнейшы, чым брат за гарой

Імя Яцэка Палкевіча стала сінонімам адважных мужчынскіх прыгод. Ён — аўтар займальных старонак у кнізе сусветнага прыгодніцкага эпасу, заснавальнік першай на еўрапейскім кантыненце школы выжывання. Летам 1996-га ён здзейсніў апошняе геаграфічнае адкрыццё XX стагоддзя: устанавіў дакладнае месцазнаходжанне вытоку Амазонкі. Цяпер 77-гадовага Яцэка Палкевіча называюць паслом міру, ён лічыць сваёй галоўнай справай наладжванне добрасуседскіх адносін паміж краінамі.

— Пан Яцэк, ці задаволены вы сваім удзелам у праграме Дня беларускага пісьменства?

— Перш за ўсё мяне цікавіў удзел у рабоце міжнароднага круглага стала «Мастацкая літаратура як шлях адно да аднаго». Цяпер я лічу сваёй місіяй спрыяць пацяпленню адносін паміж Польшчай, Расіяй, Украінай і Беларуссю. Бо што адбываецца? Працэсы глабалізацыі вядуць да ўніфікацыі мадэляў спажывання і ладу жыцця, вынішчаюць культурную разнастайнасць, размываюць нацыянальную ідэнтычнасць. Людзі сышлі ў інтэрнэт, а там у сацсетках у нас як быццам шмат сяброў, а на самай справе чалавек адзінокі і пакінуты. Так і краіны — аддаляюцца адно ад адной, успамінаюць старыя крыўды... Але ведаеце, што я зразумеў за паўвекавы вопыт вандроўніка? Тое, што сусед праз мяжу важнейшы, чым брат за гарой.

Перад ад'ездам з Варшавы я сустракаўся з віцэ-спікерам польскага парламента, які цёпла адзываўся пра адносіны з Беларуссю як з ключавым эканамічным партнёрам, краінай, дзе паважаюць палякаў. Пры гэтым відавочна, што ў беларуска-польскіх адносін яшчэ далёка не ўвесь патэнцыял выкарыстаны.

Зусім інакш выглядаюць адносіны з Расіяй. На працягу многіх гадоў я адчуваю сябе паслом пацяплення міжасобасных адносін, а таксама пабудовы згоды і братэрства паміж палякамі і рускімі, за што некаторыя мяне называюць «агентам Крамля». Я бачу: старэйшае пакаленне расіян з настальгіяй успамінае, як у гады камунізму Польшча лічылася для іх акном у Еўропу.

У Жыровіцах за круглым сталом сабраліся прадстаўнікі многіх народаў, і ўсе прыйшлі да адзінай думкі пра тое, што свет выратуе культура, а ў ёй найважнейшы складнік — кніга, слова пісьменніка, мысліцеля. Я не адмаўляю камп'ютары, смартфоны і электронныя кнігі, сам усім гэтым карыстаюся.

— З-пад вашага пяра выйшла больш за 30 кніг пра падарожжы. Якое з іх вы лічыце вашым галоўным дасягненнем?

— Мая самая вялікая перамога — Атлантыка. Мне заўсёды было цікава даведацца: а якая ж мяжа магчымасцяў чалавека? У 1975 годзе заняўся тэмай выжывання ў экстрэмальных умовах. Тады ж пераплыў на выратавальнай шлюпцы Атлантычны акіян. Часам і цяпер да канца не веру, што ўсё гэта магчыма. Тры дні нельга было не тое што спаць, але нават прыкрыць вочы. У мяне было крыху ежы і компас. Пра GPS-навігатары тады ніхто і не марыў. Усё было арганізавана так, як быццам я ў рэальнасці пацярпеў караблекрушэнне, не было нават радыёсувязі. У апошні дзень у мяне была магчымасць падняцца на борт судна. І вось я думаў: там мяне чакае цяпло, ежа, стопрацэнтная гарантыя, што вярнуся дадому жывы. А другая думка: ці буду сябе паважаць, калі здамся? Я пераплыў Атлантыку, гэта, вядома ж, падняло на неверагодны ўзровень мой аўтарытэт як падарожніка ў Еўропе.

— Які самы галоўны ўрок вы вынеслі з гэтага падарожжа?

— Фізічна, вядома, нялёгка, але асноўная барацьба адбываецца ў галаве: я забараняў сабе слова «не змагу».

— Пан Яцэк, цікава даведацца, як грамадзянін сацыялістычнай Польшчы мог падарожнічаць па свеце. У СССР такая магчымасць была ў адзінак з сотняў тысяч.

— Мая статыстыка такая: у СССР мог паехаць на Захад адзін са ста чалавек, у Польшчы — 7-10 са 100. Але ведаеце, я не ўваходзіў у гэты лік і вельмі мучыўся ад немагчымасці пабачыць свет. Вядома, я мог паехаць у Чэхаславакію, Балгарыю, але я не пра гэта марыў. Ужо ў шэсць гадоў я дакладна ведаў, што буду падарожнікам, але да 31 года не меў замежнага пашпарта. У 1971 годзе знайшоў шлях: апынуўся на тэрыторыі Заходняга Берліна, і тады для мяне адкрыўся ўвесь свет!

— А калі вы першы раз пабывалі ў Савецкім Саюзе?

— Я хацеў пабываць у Сібіры. Ну вось такі турызм — прыехаць і гуляць па Краснай плошчы — не для мяне. А Сібір — гэта экстрым, выпрабаванне сябе ў найцяжэйшых прыродных умовах. Але ў СССР мяне не пускалі — падазроны быў: паляк з італьянскім пашпартам.

Пасля перабудовы, падзення Берлінскай сцяны ў еўрапейскіх краінах так званага сацлагера стала значна лягчэй дыхаць, але і тады ў СССР мяне бачыць не жадалі. Дапамог выпадак. Неяк патэлефанаваў мой сусед у Басана дэль Грапа (я жыву адной нагой у Італіі, а другой у Польшчы), сенатар у Рыме, і сказаў, што ён вязе аднаго савецкага госця, каб паказаць яму Венецыю. Ён хацеў зайсці з ім да мяне, маўляў, спатрэбіцца маё веданне рускай мовы. Увечары на парозе майго дома, недалёка ад Венецыі, я ўбачыў Эдуарда Шэварнадзэ (у той час — міністр замежных спраў СССР. — **«Зв.»**). Па яго ўказанні ў 1987 годзе я атрымаў дазвол на ўезд у СССР. Вы пыталіся пра дасягненні... Дык вось, адзін з візітаў, праўда, ужо не ў Савецкі Саюз, а ў Расію, быў маім галоўным паражэннем.

— Што адбылося?

— Пры падтрымцы газеты «Труд» у 1994 годзе я арганізаваў экспедыцыю па Эвенкійскай аўтаномнай акрузе, дакладней па рацэ Таймыр, у складзе касманаўтаў пяці краін. Мы пабудавалі драўляныя плыты і на працягу дзесяці дзён сплаўляліся ў сэрцы запаведнага кутка Сібіры. Па берагах адкрываліся велічныя карціны прыроды. Бывала, што паблізу з'яўляліся ліса альбо лось, якія не праяўлялі асцярогі да прышэльцаў. У бязмежнай тайзе адчувалася нейкая біблейская спрадвечнасць, якая адначасова і захапляе таямнічым абаяннем, і цісне, бо ў ёй чалавек пачуваецца маленькім і страчаным, але пры гэтым адчувае поўную свабоду і шчасце. Пасля гэтага мы склалі зварот «вялікім свету гэтага», урадам, палітычным лідарам, міжнародным і грамадскім арганізацыям, прадстаўнікам буйной прамысловасці і бізнесу, кіраўнікам цэркваў, навукоўцам і ўсім жыхарам Зямлі — каб яны падключыліся да місіі па выратаванні нашай яшчэ жывой планеты. Існуе пэўная патрэба ў фарміраванні новай свядомасці, новых эканамічных падыходаў. Толькі тады, калі большая частка грамадства захоча паглядзець праўдзе ў вочы, можна будзе разлічваць на выхад з тупіка і аднаўленне жыватворнай сувязі чалавека з навакольнай прыродай.

Заклік, распаўсюджаны ўсімі вядучымі агенцтвамі навін, разляцеўся па свеце. Дні два пра гэта гаварыў увесь свет. На трэці — цішыня. Гэта цяпер вядомыя праблемы ўтылізацыі смецця, пацяплення клімату. Паверце, гэта было ўжо тады, толькі не ў такім грандыёзным маштабе, як цяпер. Вось гэта нежаданне нешта рабіць, імкненне абмежавацца рэпартажамі пра міжнародную экспедыцыю паменшыла мой аптымізм. Мы ж усё гэта арганізоўвалі не дзеля ўласнай рэкламы, а каб улады, звычайныя людзі праніклі нашым хваляваннем за стан экалогіі. Я адчуваў сябе Дон Кіхотам, які нерэальна глядзіць на жыццё. З тых часоў больш увагі аддаю іншым справам.

— Аднак жа праз два гады вы здзейснілі апошняе геаграфічнае адкрыццё XX стагоддзя: устанавілі дакладнае месцазнаходжанне вытоку Амазонкі.

— Гэта вельмі цікавая рэч. Мы адправіліся ў экспедыцыю пад сцягам Рускага геаграфічнага таварыства. У тэорыі ў Амазонкі было 3-5 «месцаў нараджэння», мы ж вырашылі даведацца дакладнае. Рыхтаваліся да экспедыцыі паўтара года. Нам вельмі дапамагалі здымкі з космасу. Для мяне важна не тое, што рака даўжэйшая, а тое, што мы ведаем, дзе яе выток.

— Ва ўсіх энцыклапедыях адзначаецца, што ў вас білет РГТ пад нумарам сем. Раскажыце, як вас запрасілі ў Рускае геаграфічнае таварыства?

— Так супала, што інтэрв'ю са мной часопіс «Огонёк» надрукаваў, калі Уладзімір Пуцін распарадзіўся закрыць РГТ. А ў мяне журналіст пытаецца, што б я адказаў — як работу ў РГТ паставіць на сучасныя рэйкі. Літаральна праз пару дзён раздаўся званок з сакратарыята прэзідэнта РГТ Сяргея Шайгу і запрашэнне сустрэцца ў вузкім коле. Не палічыце за хвальбу, але многія мае ідэі рэалізаваны ў РГТ. Так я атрымаў білет № 7.

— Але вы яшчэ і член элітнага Каралеўскага геаграфічнага таварыства ў Лондане...

— Гэта такая магутная структура, якая дзейнічае з 1830 года. Туды мяне прынялі як пераможцу акіяна, дзякуючы падтрымцы майго сябра Тура Хеердала.

— Мне здалося, што вы не дужа любіце палітыку, у той жа час бераце на сябе місію пасла свету. Тут няма супярэчнасці?

— Як падарожнік я прапагандую пазітыўны погляд на свет і ганаруся тым, што магу быць свабодным і вышэйшым за ўсе палітычныя падзелы. Я сябрую з усімі! Тры польскія прэзідэнты посткамуністычнага перыяду былі ў мяне на вячэры дома ў Варшаве. Сярод маіх гасцей і паслы Расіі ў Польшчы. Думаю, што з Беларусі таксама будуць высокія госці. Мая душа адкрыта для ўсіх людзей, якія імкнуцца да добрасуседства. Я вам скажу, што простым людзям не патрэбныя ўсе гэтыя канфрантацыі, санкцыі, і нават шмат хто з палітыкаў гэтак жа мяркуе, толькі ў іх не заўсёды хапае смеласці прызнаць гэта.

— Вы аб'ездзілі ўвесь свет, жывяце на дзве краіны — Італію і Польшчу. Кім сябе адчуваеце: чалавекам свету ці палякам?

— Еўрапейцам з польскімі каранямі. А мая мама ў 30-я гады мінулага стагоддзя вучылася ў Гродне. І я шчаслівы, што пабываў у гэтым горадзе, выступіў перад студэнтамі Гродзенскага ўніверсітэта. На мой погляд, Гродна — такі горад, дзе вельмі добра адчуваецца, наколькі блізкія народы Польшчы і Беларусі.

— У першы дзень прыезду ў нашу краіну вы казалі, што здзіўлены ўбачаным і зачараваныя. А што скажаце сёння, перад ад'ездам?

— Упэўнена скажу, што яшчэ пара прыездаў да вас, і я стану добраахвотным паслом Беларусі ў Еўропе. А пакуль зраблю ўсё, што ў маіх сілах, для паляпшэння сяброўскіх і добрасуседскіх адносін паміж Польшчай і вашай незвычайнай краінай.

Дарэчы, карыстаючыся выпадкам, хачу паднесці сувенір чытачам «Звязды» — магчымасць бясплатна спампаваць з майго сайта кнігу «Па бездаражы свету» на рускай мове. Яна даступна на сайце **palkiewicz.com** у раздзеле «ksiazki».

Аксана ЯНОЎСКАЯ.
Фота з асабістага архіва Яцэка ПАЛКЕВІЧА.

Правила проведения Рекламной

Настоящие правила проведения рекламной игры «PROCOFFEE» (ПРОКОФИ) (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями) и определяют порядок проведения рекламной игры «PROCOFFEE» (ПРОКОФИ) (далее – Рекламная игра).

Термины

В настоящих Правилах нижеперечисленные термины имеют следующее значение:

Карточка «PROCOFFEE» (ПРОКОФИ) – инструмент участника Рекламной игры в виде картонной карточки с нанесенным на него местами (15 мест) для проставления оттисков штампов с номерами заведений. Карточка «PROCOFFEE» (ПРОКОФИ) выдается при приобретении в период с 11 сентября 2019 г. по 29 сентября 2019 г. включительно первого Игрового сета в заведениях, указанных в таблице пункта 5 настоящих Правил.

Владелец заведений – юридическое лицо или индивидуальный предприниматель, указанный в столбце 3 таблицы пункта 5 настоящих правил.

Заведения – объекты общественного питания, адреса которых указаны в столбце 2 таблицы пункта 5 настоящих Правил.

Штамп с номером заведения – цветной штамп с номером от 1 по 15 включительно, предназначенный для проставления на карточке ***«PROCOFFEE» (ПРОКОФИ),*** оттиск которого является подтверждением факта приобретения участником Игрового сета в объекте общественного питания, указанного в п. 5 настоящих Правил. Штампы заведений, расположенных в одном и том же городе, имеют одинаковый цвет и отличаются от цветов штампов заведений, расположенных в других городах. При этом для целей настоящих Правил:

- кофейням «Параграф» (ООО «ПараграфГрупп»), расположенным по следующим адресам: г. Брест, ул. Карбышева, 32; г. Брест, ул. Советская, 30; г. Брест, ул. Советская, 66, присваивается один и тот же номер и цвет штампика, и для целей настоящих Правил такие заведения рассматриваются в качестве одного заведения;

- кофейне «Сонет» и бару «Солод» (Частное предприятие «Фаруза»), расположенным по следующим адресам: г. Брест, ул. Советская, 110; г. Брест, ул. Дубровская, 7а, присваивается один и тот же номер и цвет штампа, и для целей настоящих Правил такие заведения рассматриваются в качестве одного заведения;

- кафе «GARAGE» (ГАРАЖ) (ООО «ГаражИнвестмент А»), расположенному по адресу: г. Гомель, ул. Косарева, 18, и кафе «GARAGE» (ГАРАЖ) (ООО «Высокие цели»), расположенному по адресу: г. Гомель, пр-т Речицкий, 5в, присваивается один и тот же номер и цвет штампа, и для целей настоящих Правил такие заведения рассматриваются в качестве одного заведения.

Игровые сеты – сеты, реализуемые заведениями в период с 11 сентября 2019 г. по 29 сентября 2019 г. включительно в заведениях по специальной цене для физических лиц – 5 белорусских рублей 50 копеек за один сет (состоит из 1 порции кофейного напитка и 1 порции десерта). Каждое заведение с 11 сентября 2019 г. по 29 сентября 2019 г. включительно предлагает к реализации 1 (один) вариант своего игрового сета. Сеты заведений отличаются.

При этом:

- кофейни «Параграф» (ООО «ПараграфГрупп»), расположенные по следующим адресам: г. Брест, ул. Карбышева, 32; г. Брест, ул. Советская, 30; г. Брест, ул. Советская, 66, предлагают к реализации один и тот же вариант сета;

- кофейня «Сонет» и бар «Солод» (Частное предприятие «Фаруза»), расположенные по следующим адресам: г. Брест, ул. Советская, 110; г. Брест, ул. Дубровская, 7а, предлагают к реализации один и тот же вариант сета;

- кафе «GARAGE» (ГАРАЖ) (ООО «ГаражИнвестмент А»), расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Косарева, 18, и кафе «GARAGE» (ГАРАЖ) (ООО «Высокие цели»), расположенное по адресу: г. Гомель, пр-т Речицкий, 5в, предлагают к реализации один и тот же вариант сета.

1. Сведения об организаторе

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «КОФЕ СЕРВИС», УНП 191128296 (далее – Организатор) с местом нахождения по адресу: 220090, г. Минск, Логойский тракт, д. 37, пом. офисное 18. Электронный адрес: marketing@coffeeservice.by.

2. Сведения о заинтересованных лицах

Заинтересованными лицами Рекламной игры являются:

- ООО «Глорис», УНП 191436462, юридический адрес: г. Минск, ул. Казинца, д. 4, каб. 517;

- ИООО «ДанонБел», УНП 191047642, юридический адрес: г. Минск, пр-т Машерова П. М., д. 76а, пом. 3 (оф. 3);

- ООО «Залант Групп», УНП 192033734, юридический адрес: г. Минск, ул. Железнодорожная, д. 33а, пом. 14;

- Унитарное предприятие «КАРАВАН», УНП 800013191, юридический адрес: Минская обл., Логойский р-н, г. Логойск, ул. Тимчука, д. 1, пом. 137;

- СЗАО «Недраивест», УНП 100670071, юридический адрес: Минская обл., Минский р-н, д. Цна, цех по розливу питьевой воды;

- ООО «Рич-маркет», УНП 193049042, юридический адрес: г. Минск, ул. Калиновского, д. 77а, каб. 322;

- ООО «СетьКомпанийСмайл», УНП 391822181, юридический адрес: г. Витебск, ул. Янки Купалы, 2-1, пом. 5;

- ОАО «Туровский молочный комбинат», УНП 490871155, юридический адрес: Гомельская обл., Житковичский р-н, г. Туров, ул. Ленинская, д. 154.

3. Наименование Рекламной игры

Рекламная игра проводится под названием «PROCOFFEE» (ПРОКОФИ) (далее – Рекламная игра).

4. Участники Рекламной игры

4.1. Участниками Рекламной игры могут быть:

- дееспособные граждане Республики Беларусь;

- дееспособные иностранные граждане, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь;

- дееспособные лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь;

- дееспособные лица без гражданства, которым предоставлен статус беженца в Республике Беларусь.

4.2. Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

5. Территория проведения Рекламной игры

Рекламная игра проводится на территории следующих объектов общественного питания в городах: Брест, Витебск, Гродно, Гомель, Могилев, Бобруйск:

№ штампа	Адрес объекта общественного питания	Наименование и УНП владельца объекта общественного питания	Наименование бренда под которым осуществляется общественное питание
	г. Брест (цвет штампа – синий)		
1	г. Брест, ул. Карбышева, 32	ООО «ПараграфГрупп», УНП 291309679	Кофейня «Параграф»
	г. Брест, ул. Советская, 30	ООО «ПараграфГрупп», УНП 291309679	Кофейня «Параграф»
	г. Брест, ул. Советская, 66	ООО «ПараграфГрупп», УНП 291309679	Кофейня «Параграф»
2	г. Брест, ул. Советская, 130	Частное предприятие «АртамоновИнвест», УНП 291341251	Кофейня «Корица»
3	г. Брест, ул. Советская, 24-2	ООО «ПрофиСэйлз», УНП 291263768	Кофейня «Штрудель»
4	г. Брест, ул. Советская, 110	Частное предприятие «Фаруза», УНП 290486989	Кофейня «Сонет»
	г. Брест, ул. Дубровская, 7а	Частное предприятие «Фаруза», УНП 290486989	Бар «Солод»
5	г. Брест, ул. Советская, 30	Унитарное предприятие «Санта Рест», УНП 291261699	Кафе «Times cafe» (Таймс кафе)
6	г. Брест, ул. Чкалова, 7	ООО «Инвест-М», УНП 290472994	Ресторан «Эрмитаж»
7	г. Брест, ул. Варшавское шоссе, 41	ООО «Евро Отель», УНП 291554478	Ресторан «EMBRACE» (ИМБРЕЙС)
8	г. Брест, ул. Лейтенанта Рябцева, 124	ООО «ДМТХОРЕКА», УНП 291140599	Клуб «11:11»
9	г. Брест, ул. Московская, 275 (ДК профсоюзов, 2-й этаж)	ООО «ИВАРДРестГрупп», УНП 291609491	Кафе «Мимино»
10	г. Брест, ул. Куйбышева, 13	Частное предприятие «БригантинаНайтКлаб», УНП 291077884	Ресторан «Бригантина»
11	г. Брест, ул. Гоголя, 45-1	ООО «Михфуд», УНП 291511762	Кафе быстрого обслуживания «ПастаБар»
12	г. Брест, ул. Советская, 73	ООО «Лаилик», УНП 290310357	Кафе «Gran Caffe» (Гран Каффе)
13	г. Брест, ул. Мицкевича, 17-2	ИП Семенюк Н. А., УНП 291507187	Мини-кафе «Тепло»
14	г. Брест, ул. Гоголя, 65	ИП Менько Н. В., УНП 291553535	Кафе-кондитерская «Cherie» (Шери)
15	г. Брест, ул. Гоголя, 29	Унитарное предприятие «Санта Рест», УНП 291261699	Ресторан «Жюль Верн»
	г. Гомель (цвет штампа – зеленый)		
1	г. Гомель, ул. Пушкина д. 2	ООО Кунжут, УНП 491328625	Ресторан быстрого обслуживания «Кунжут»
2	г. Гомель, ул. Ленина, 24	ЧТУП «Мелкая Розница» УНП 490180642	Кофейня «ЗеКлер»
3	г. Гомель, ул. Кирова, 90а	ЧТУП «Контакт», УНП 400081101	Ресторан «RASSKAZOV» (РАССКАЗОВ)
4	г. Гомель, ул. Советская, 30	ЧТУП «Контакт», УНП 400081101	Кофейня «Аркада de Lux» (дэ Люкс)
5	г. Гомель, ул. Кирова, 35	ЧТУП «Контакт», УНП 400081101	Бар «ГрильХаус»
6	г. Гомель, ул. Победы, 8/32	ИП Елина Е. М., УНП 491356722	Кофе-бар «Уголек»
7	г. Гомель, ул. Коммунаров, д. 6	СООО «РосИнтертэйнмент», УНП 800011094	Ресторан «Патио»
8	г. Гомель, ул. Белого, 19а	ОАО «Табаквинторг», УНП 400078357	Кафе «Барчетта»
9	г. Гомель, пр-т Речицкий, 5в, пом 1-3	ООО «Моя Троюродная бабушка», УНП 491317614	Кофейня «Кофе Тост»
10	г. Гомель, ул. Косарева, 18-23	ООО «ГаражИнвестмент А», УНП 491333903	Кафе «GARAGE» (ГАРАЖ)
	г. Гомель, пр-т Речицкий, 5в	ООО «Высокие цели», УНП 192656237	Кафе «GARAGE» (ГАРАЖ)
11	г. Гомель, ул. Ленина, д. 41	ООО «Джуликап», УНП 491336772	Кофейня «Smile Coffee» (Смайл Кофи)
12	г. Гомель, ул. Кожара, д. 6а	ООО «Ресторанный дворик», УНП 491321738	Ресторан быстрого питания «Пиццбург»
13	г. Гомель, ул. Ленина, 3	ООО «Сэф-торг», УНП 491336121	Кафе «Адажио»
14	г. Гомель, ул. Советская, 22	ООО «ФудПрайм», УНП 491335789	Кофейня «Дилемма»
15	г. Гомель, пр. Ленина, 10	ООО «Кофетост», УНП 491326449	Кофейня «Кофе Тост»
	г. Могилев (цвет штампа – желтый)		
1	г. Могилев, ул. Ленинская, 30	ИП Кондратенко П. А., УНП 791004565	Мини-кафе «Республика»
2	г. Могилев, ул. Ленинская, 22	ООО «Интер Авто Центр», УНП 790823768	Ресторан «KINZA» (КИНЗА)
3	г. Могилев, ул. Ленинская, 27	ЧУП «Вендиинг-Могилев», УНП 790776201	Кофейня «Коффа»
4	г. Могилев, ул. Ленинская, 5-1	ЧУП «Браво-люкс», УНП 790373055	Мини-кафе «Сел и Съел»
5	г. Могилев, ул. Ленинская, 40	ИП Коткин Р. А., УНП 791127152	Кофейня «Котофейня»
6	г. Могилев, ул. Ленинская, 40	ИП Книга С. В. , УНП 290446606	Кофейня «Realist cafe» (Реалист Кафе)
7	г. Могилев, ул. Ленинская, 49/20	ИП Диденко В. В., УНП 791104333	Чебуречная «МОГ»
8	г. Могилев, ул. Буденного, 13	ОДО «Найсус», УНП 790368798	Кафе «Жорж Симоне»
9	г. Могилев, ул. Первомайская, 23/2	ООО «Смакуш плюс», УНП 791099471	Ресторан «Мясникъ» (Мясник)
10	г. Могилев, ул. Крыленко, 7	Частное предприятие «Смакуш», УНП 790759222	Кафе «Смакуш»
11	г. Могилев, ул. Ленинская, 29-2	ООО «ФаберКор», УНП 791097241	Ресторан «У Сафрона»
12	г. Могилев, ул. Первомайская, 26Б	Частное предприятие «Альза», УНП 790921390	Таверна «На почтовой»
13	г. Могилев, ул. Буденного, 13-52	ИП Быков В. С., УНП 790373226	Кофейня «Сладости»
14	г. Могилев, пр. Мира, 23, к-р «Октябрь»	ИП Продолятченко Д. В., УНП 790583589	Кафе «Кофе номер 1»
15	г. Могилев, ул. Ленинская, 50б	ЧУП «Браво-Люкс», УНП 790373055	Мини-кафе «Кинг Шаурма»
	г. Бобруйск (цвет штампа – черный)		
1	г. Бобруйск, ул. Советская, 95в	ООО «Прокофий-Групп», УНП 791105582	Кафе «Любимое место»
2	г. Бобруйск, ул. Горького, 36	ИП Меленчук О.Г., УНП 791119087	Кофейня «Зробім»
3	г. Бобруйск, ул. Минская, 101/103-3	ИП Меленчук О.Г., УНП 791119087	Кофейня «Зробім»
4	г. Бобруйск, ул. Социалистическая, 97	Частное предприятие «Ре Ки», УНП 790490425	Кафе «ТиКава»
5	г. Бобруйск, ул. Строителей, 58, пом 77	ООО «Донатика групп», УНП 791105886	Кафе «Donatica» (Донатика)
6	г. Бобруйск, ул. Советская, 97/3	ООО «Донатика групп», УНП 791105886	Кафе «Donatica» (Донатика)
7	г. Бобруйск, ул. Горького, 12-32	ООО «Донатика групп», УНП 791105886	Кафе «Donatica» (Донатика)
8	г. Бобруйск, ул. Интернациональная, 20	ООО «ДРЦ Нэмо», УНП 790913759	Кофейня «Кофе Саунд»
9	г. Бобруйск, ул. Пушкина, 204/31	ООО «ДРЦ Нэмо», УНП 790913759	Кофейня «Кофе Саунд»
10	г. Бобруйск, ул. Социалистическая, 68	ЧТУП «ОгонекЛюкс», УНП 790236858,	Кафе «Пицца Браво»
11	г. Бобруйск, ул. Советская, 91/3	ИП Махлай А. С., УНП 791061911	Кофейня «PRAVDA» (Правда)
12	г. Бобруйск, ул. Социалистическая, 78-1	ИП Варивончик О. О., УНП 791003530	Кофейня «Coffee Varka» (Кофе Варка)
13	г. Бобруйск, ул. Комсомольская, 39-7	ООО «КАПУЛУС», УНП 391731906	Кофейня «Смайл Кофе»
14	г. Бобруйск, ул. Минская, 135	ИП Щурко А. М., УНП 791073255	Кофейня «Кафе Вайт»
15	г. Бобруйск, ул. Социалистическая, 97	ООО «Кантри Стиль», УНП 790914939	Кафе «История»
	г. Витебск (цвет штампа – красный)		
1	г. Витебск, пр-т Фрунзе, 8, пом. 23	ООО «Найверт», УНП 391824674	Кофейня «Smile Coffee» (Смайл Кофи)
2	г. Витебск, пр-т Фрунзе, 15	ООО «Кафана», УНП 391380537	Кафе «Эль кафе плюс»
3	г. Витебск, ул. Суворова, 28	ЧТУП «Винсет», УНП 391508718	Кафе «Граф Суворов»
4	г. Витебск, ул. Замковая, 4	Иностранное частное предприятие «БогемаПлюс», УНП 391000722	Кафе «Волшебник»
5	г. Витебск, ул. Суворова, 2	ООО «Шоколад», УНП 390333065	Кофейня
6	г. Витебск, пр-т Черняховского, 4/50	ОДО «ДиВинчи», УНП 391412027	Кафе «Food Avenue 33» (Фуд Авеню 33)
7	г. Витебск, ул. Замковая, 2а	ОДО «ДиВинчи», УНП 391412027	Кафе «Собрание»
8	г. Витебск, ул. Ленина, 26а	ИП Сердюк Г. С., УНП 391318257	Кофейня «Kapuchino.by» (Капучино.бай)
9	г. Витебск, пр. Московский, 30	ООО «Валериден», УНП 391822125	Кофейня «Smile Coffee» (Смайл Кофи)
10	г. Витебск, пр-т Московский, 11/1	ООО «АрВитСтрой», УНП 391415610	Кафе «Меланж»
11	г. Витебск, ул. Толстова, 3	ООО «Домино-кафе», УНП 391806829	Кафе «Домино»
12	г. Витебск, ул. Суворова, 7/8	ООО «МаршрутПлюс», УНП 391351709	Кафе «Домино»
13	г. Витебск, ул. Баграмяна 12	ООО «Домино-кафе», УНП 391806829	Кафе «Домино»
14	г. Витебск, пр-т Московский 16	ООО «Хмельная хата», УНП 391365497	Кафе «Домино»
15	г. Витебск, пр-т Московский, 7	ООО «Гараж ГМБХ», УНП 391006269	Кафе «GARAGE» (ГАРАЖ)
	г. Гродно (цвет штампа – фиолетовый)		
1	г. Гродно, ул. Ожешко, на территории парка Жилибера	ЧТУП «Юльвен», УНП 590999335	Мини-кафе «BESEDKA» (БЕСЕДКА)
2	г. Гродно, Дубко, 17	ООО «ДонерБел», УНП 591025879	Ресторан быстрого обслуживания «MC Doner» (МС Донер)
3	г. Гродно, ул. Победы, 35	ООО «Метро Клуб», УНП 590618088	Кафе «Баста Паста»
4	г. Гродно, ул. Дубко, 17	ООО «Метро Клуб», УНП 590618088	Ресторан «Старый город»
5	г. Гродно, ул. Советская, 5	ООО «Титанмедиа», УНП 590886711	Кофейня «Я»
6	г. Гродно, ул. Виленская, 6	ООО «Азбука кофе», УНП 591020532	Кофейня «Виленская»
7	г. Гродно, ул. Ожешко, 33/16	ИП Трунов В.А., УНП 591922600	Кофейня «Атмосфера»
8	г. Гродно, ул. Ожешко, 3	ОАО «Гродненский мясокомбинат», УНП 500043292	Ресторан «Королевская охота»
9	г. Гродно, ул. Мостовая, 33, пом. 33	ООО «БелФэшнЛаб», УНП 591029606	Кофейня «КаваБанга»
10	г. Гродно, Дзержинского, 1/1	ООО «Лувак», УНП 591018876	Кофейня «Шекспир»
11	г. Гродно, ул. Элизы Ожешко, 35а	ИП Махнева Е. М., УНП 591265134	Кофейня «Кофе Саунд»
12	г. Гродно, ул. Карла Маркса, 5	ООО «СБ НОРМАЛ», УНП 591025932	Кофейня «Гарадзенская кавярня»
13	г. Гродно, ул. Советская, 7	ГТУП «ЛИМОЖ», УНП 500154505	Кофейня «Раскоша 1795»
14	г. Гродно, ул. Мостовая 31	ЧТУП «ТУСЭ ГРУПП», УНП 591028880	Бар «Гранат»
15	г. Гродно, ул. Большая Троицкая, 29-2	Частное предприятие «Кофе пауза», УНП 591027871	Кофейня «Кофе пауза»

6. Срок начала Рекламной игры: 11 сентября 2019 г.

